Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2658) Год LII | Беласток, 22 красавіка 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Паміж касцёлаў

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Касцёл у Сакалянах

Аўтобус пэкаэсу, што рана з Саколкі едзе ў Сідэрку, паступова губляе пасажыраў і з Паўловіч у Залессе прыязджаю ўжо сам; шчаслівенька на маё месца падбірае іншага, пусты не паедзе. Само Залессе вітае дзень спакоем, пункт прыёму малака ўжо закрыты, крама сідранскага гээсу толькі будзіцца. Абедзве ўстановы ў прыстойным месцы — насупраць касцёла. Касцёл у Залессі пастаўлены ў 1602 годзе, але гэты рупліва задбаны помнік выдатнай даўніны крочыць з духам часу, несучы на адной з вежаў спадарожнікавую „талерку", якая, мабыць, прымае багаслоўскую страву проста з неба. Перад касцёлам каменная стэла Юзафу Пілсудскаму.

Каля адгалінавання дарогі ў Беняшы стаіць двухпавярховая мураванка ранейшай школы. І хаця быццам два ці тры гады таму купіў гэты будынак нейкі беластачанін, лёс збудавання падобны да лёсу ўсіх пакінутых аб'ектаў: шмат шыб пабіта, некаторыя разам з рамамі.

Недалёка ад школы парафіяльныя могілкі, дзе магілы трымаюцца шчыльна, занадта не распаўзаючыся. Месца для іх адведзена многа і, беручы пад увагу сённяшнія дэмаграфічныя тэндэнцыі, павінна яго хапіць да канца свету. Многа тут намагільных крыжоў не з бетону ці каменя, але з металічных труб.

Заходжу ў Даўгасельцы. Вёска гэтая даволі рэдкімі забудовамі раскінута вакол жвіроўкі на працягласці трох кіламетраў; адсюль і назва вёскі. Насупраць адной з хат пажылая жанчына рубае голле і кладзе яго тут жа, на траўцы, у касцёрчыкі. Наяўнасць шнурка для снапавязалак дазваляе дадумоўвацца, што пазней павяжа іх у пучкі і перанясе на панадворак.

Жанчына займаецца такой работай па простай прычыне — не мае ўжо мужа. Такіх адзінокіх жанчын у Даўгасельцах чатыры. А колькі ўсіх душ у вёсцы, сказаць складана; мая субяседніца мяркуе, што будзе каля дваццаці сем'яў, але на маё пытанне пра пражываючых тут круглы год заяўляе пра меншы іх лік. Ёсць тут і пажылыя людзі, але ёсць і дзеці, якіх аўтобус возіць у школу ў Кузніцы.

Вялікатаварных гаспадарак у Даўгасельцах няма. На маю заўвагу, што ўсё-такі нехта абрабляе палеткі навокал вёскі, жанчына заяўляе:

— Палеткі абрабляюць, бяруць за гэта даплаты з Уніі і прапіваюць іх.

Вось такім — на экалагічным паліве — бывае ў наш час рухавік сельскагаспадарчай вытворчасці. Ураджай — авёс, ячмень і нават пшаніцу — земляробы прадаюць у ГС у Сідры. Крамы тут мабільныя — тройчы ў тыдзень прыязджае машына з Кузніцы і тройчы з Сідры.

Калісь дачуўся я ў нейкай суседняй вёсцы, што крыху кавалераў з Даўгасельцаў узялі ў жонкі дзевак з Беларусі. Аднак гэтая вестка аказалася недакладнай. Гэта ў Ставарова прыехалі ў замужжа дзве дзяўчыны з Усходу, а ў Даўгасельцах толькі адзін узяў жонку адтуль.

— І яна ўжо знайшла працу, але ў сваіх, у рускіх, у Гродна паехала, — паведамляе мне субяседніца.

— І ён за ёю выехаў? — пытаю.

— Не, ён тут астаўся.

— Раскідаўся іхні шлюб?

— Не, яна час ад часу прыязджае да яго.

Каля нас спынілася машына.

— Гэта мая дачка з зяцем прыехалі, — патлумачыла жанчына. — Паедзем на могілкі ў Кузніцу, прыбраць магілкі.

Развітаўся я з жанчынай, якую пажылы лёс прымусіў каратаць час з сякерай у руцэ. Далей падаўся я назіраць за Даўгасельцамі самастойна. Некаторыя, вельмі немнагалікія хаты нарыхтаваны ўжо прымаць насельнікаў толькі ў летні сезон. Бадай больш за палову жылых будынкаў запушчаны. Заселеных падалося мне каля дзесяці хат. На адным з панадворкаў паказалася дзяўчынка ў школьным узросце. На адным з палеткаў за вёскай немалады мужчына абсяваў зямлю з вядра. Каля іншай хаты стаялі два — дзесяці- і дваццацілітровы — малочныя бітоны; на панадворку камбайн і два трактары. На вуліцы-жвіроўцы быў след капыт двойкі коней. На незаросłых сенажацях, што аддзяляюць вясковыя збудаванні ад левага адгалінавання рэчкі Ласосны, радкамі ляжаць сабраныя адтуль большыя камяні. Недзе пасярэдзіне вёскі каля ствала буйной таполі ляжыць валун з замацаваным у ім усходнім металічным крыжыкам. Такі ж самы рэлігійны сімвал знаходзіцца і ў канцы вёскі, што з боку прыхадской Кузніцы. Побач апошняга стаіць і мураваны праваслаўны крыж з 1954 года.

Меляшкоўцы трымаюцца яшчэ зямлі, тут яшчэ відаць шмат пашы ў вялікіх фольгавых упакоўках. Пры дарозе крыж, прысвечаны двум жаўнерам з адлеглых польскіх гарадоў, якіх жыццю было наканавана спыніцца менавіта тут.

У Паўлавічах працуе яшчэ школа, у якую „маім" ранішнім аўтобусам прыехалі з Саколкі чатыры настаўніцы; адна з іх ехала аж з Беластока. Адукаваныя людзі паўцякалі ў гарады, каб адукаваць чарговых — для далейшых уцёкаў?..

У Стараўлянах задзівіў мяне велізарны праваслаўны крыж, пастаўлены з поўдня вёскі. Калісь у Кусцінцах адна жанчына, што выросла ў Стараўлянах, заявіла мне, што ў вёсцы ейнага дзяцінства ў выніку пасляваеннага тэрору не асталося ніводнай праваслаўнай душы. Праверыць гэта я спытаў у двух мужчын, што любаваліся сонейкам на найбліжэйшым панадворку.

— Ёсць, — адказалі мне. — Бадай шэсць сем'яў, старыя і малыя. Крыж той пастаўлены даўно, пятнаццаць а мо нат дваццаць гадоў таму.

Са Стараўлян падаўся я ў бок Сакалян. Жвіроўка ад Стараўлян тут свежанькая, сёлетняя. Побач дарогі ляжаць сасновыя каранішчы, вырваныя з сараказгадовага лесу ў час нівеліроўкі. Нівеліроўка раскрыла таксама структуру мясцовага грунту, вымашчанага меншымі і большымі камянямі. Такая свежанькая жвіроўка з'яўляецца добрай прыродна-адукацыйнай дарожкай.

Увагу едучага шашой з Дубровы ў Саколку прыцягвае сакалянскі касцёл. Пабудаваны ён на ўзгорку і вядуць да яго высокія ўсходкі. І ці гэта не такая гара з мноствам прыступак мацавала веру? Удзел у малітве быў жа свайго роду пілігрымкай, якую не кожнаму целу было пад сілу адолець. А калі глянуць шырэй, можна заўважыць, што найбольш цвёрдымі носьбітамі веры былі ці не найчасцей жыхары гор. Ды і найбольш вядомыя ў нас паломніцтвы адбываюцца ў жніўні на дзве гары.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Думкі пра думкі ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Зайшоў да мяне знаёмы. Паразмаўлялі мы на розныя тэмы, у тым ліку і пра палітыку. Высветлілася, што ў іх сям'і наконт палітычных поглядаў і асабістых сімпатый да палітычных дзеячаў на Беларусі існуюць вялікія разыходжанні. Дзеці прытрымліваюцца адных прыярытэтаў, а старыя бацькі зусім іншых. Прычым іх погляды розняцца дыяметральна супрацьлегла па ўсіх кірунках. І па магчымых шляхах развіцця краіны, і пра эканамічны лад, і пра саюзнікаў Беларусі ў асобе тых або іншых дзяржаваў...

У Чаромсе... ☞ 4

Уладзімір СІДАРУК

Аб чыгуначнай Чаромсе, а канкрэтна аб Чаромхаўскай гміне, пісалася шмат у беластоцкіх СМІ, асабліва ў час выбарчай кампаніі ў мясцовае самакіраванне. Не стану вяртацца да мінулага, але засяроджуся на апошніх паслявыбарчых падзеях, вынікам якіх стала тое, што на пасаду войта чарговы раз быў выбраны Міхал Врублеўскі, які застаецца на пяты тэрмін паўнамоцтваў. У новую Раду гміны ўвайшло пятнаццаць дэпутатаў, у тым ліку дванаццаць „новых"...

Жыровічы ... ☞ 5

Ганна КАНДРАЦЮК

Ці кожны можа спыніцца ў Жыровічах?

Прачыстая Багародзіца ўсіх прымае!

Такія словы можна прачытаць у буклеце, прысвечаным Жыровіцкаму манастыру. Тэарэтычна, сапраўды гэта так. Аднак, каб рэальна і практычна спыніцца ў манастыры ды насыціцца яго святым духам, неабходнае бласлаўенства. На фортачцы каля будкі дзяжурнага бачу шыльдачку: *Без благословения вход запрещен!...*

СПАЧУВАННІ

Спадару **Янку Лешчуку і Ягонай сям'і** словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яго гора

— смерці Бацькі —

выказваюць сябры і працаўнікі Беларускага музея ў Гайнаўцы.

9 770546 196000

Думкі пра думкі

Зайшоў да мяне знаёмы. Паразмаўлялі мы на розныя тэмы, у тым ліку і пра палітыку. Высветлілася, што ў іх сям'і наконт палітычных поглядаў і асабістых сімпатый да палітычных дзеячаў на Беларусі існуюць вялікія разыходжанні. Дзеці прытрымліваюцца адных прыярытэтаў, а старыя бацькі зусім іншых. Прычым іх погляды розняцца дыяметральна супрацьлегла па ўсіх кірунках. І па магчымых шляхах развіцця краіны, і пра эканамічны лад, і пра саюзнікаў Беларусі ў асобе тых або іншых дзяржаваў.

На пачатку нічога незвычайнага ў тым я не заўважыў. Што тут такога, калі ў коле адной сям'і ёсць розныя погляды. Справа натуральная. Але калі пагаварыў я наконт гэтага яшчэ з некалькімі маладымі людзьмі, то заўважыў, што такая сітуацыя ёсць у многіх. Палітычныя погляды маладых адны, а старэйшых людзей, асабліва пенсіянераў, іншыя.

І ў гэтым сапраўды адчувалася нейкая сістэма, бо сімпатыі да той або іншай палітычнай постаці ў Беларусі, у многіх выпадках, належаць вялікаму адсотку цэлага пакалення. Вялікая колькасць старэйшых людзей, па маіх назіраннях, падтрымлівае існую ўладу. Пры гэтым наракае на яе, кажа пра зробленыя ёй памылкі і не верыць, што тыя памылкі будуць выпраўленыя. Толькі мяняць таго хто ёсць на кагось новага баіцца.

А вельмі вялікая колькасць маладых людзей улады мяняць не баіцца. Наадварот, ім нават хочацца, каб тая ўлада мянялася як мага часцей. У іх іншыя праблемы — на каго мяняць. Вось тут у гэтага пакалення вялікія разыходжанні. Адны хочуць таго, другія іншага. Але яны гатовыя прыслухацца да думкі свайго апанента і могуць паддацца яго перакананню, гэтак жа як і пераканаць таго ў сваёй праваце.

У роздумах пра прычыны, якія так розняць палітычныя прыярытэты розных пакаленняў, я аднойчы ўключыў тэлевізар. Ішла гумарыстычная праграма з удзелам Міхаіла Жванецкага. Яму задалі пытанне, чаму той не жартуе „ніжэй паясніцы" (гаворачы прасцей — на сексуальныя тэмы). Маўляў, публіцы гэта падабаецца, бо людзі, нібыта, купляюць білеты на канцэрт, каб расслабіцца і ні пра што не думаць. А гумар Жванецкага вельмі сур'ёзны і прымушае задумвацца пра многія жыццёвыя з'явы. Гумарыст адказаў, што чалавек ні на хвіліну не павінен перастаць думаць, бо калі хоць на момант не стане гэтага рабіць, то больш ужо не зможа думаць усё далейшае жыццё. І тады падаюць самалёты, сходзяць з рэйкаў цягнікі, узрываюцца атамныя станцыі, прыкладам, Чарнобыльская АЭС, і абіраецца народам тая ўлада, якая сама сябе абірае.

І тут мне трохі праяснілася ў галаве і на тэму маіх роздумаў. Сапраўды, некалі, у часы Савецкага Саюза ні пра што думаць не трэба было. Прыкладам, ламаць галаву як пабудаваць сабе кватэру чалавек не мог. Не дазвалялася яе будаваць. Стаў на чаргу і чакай свайго часу. А пра тое, калі той час прыйдзе, думалі іншыя — тыя, хто быў пры ўладзе. А можа не думалі і яны. Працу табе таксама давалі. Беспрацоўя не было. І паспрабуй толькі не працаваць. Пашкадуеш. Дэпутатаў рэкамендавалі падтрымаць такіх, якіх трэба. Адзін бюлетэнь — адзін дэпутат. Думаць не трэба. Узяў той лісток з прозвішчам і кінуў у скрынку. Нехта ўжо за цябе падумаў, хто мусіць прадстаўляць цябе ў Вярхоўным Савеце. І цэлае пакаленне развучвалася думаць. Вучылася толькі сумленна і цяжка працаваць, змагацца і ахвяраваць сабой. Але не думаць.

І калі нешта сказалі па радыё, то гэта так і ёсць. У газетах, якія адлюстроўвалі адзіную дзяржаўную ідэалогію, таксама, нібыта, лгаць не будуць. А калі чытаць лянуешся, то ўсё адно прымусяць выпісаць тыя газеты, а пасля яшчэ па тэлебачанню раскажуць тое ж, што ў газетах напісана. І не толькі не трэба думаць, а нават шкодна, бо мысліцеляў маглі і пакараць.

Вось і засталося цвёрдае перакананне ў галовах тых людзей, хто не змог перабудавацца і ўбачыць, што час ідзе і свет змяніўся, што пры ўладзе сядзяць разумнейшыя ад цябе. І што за цябе нехта пра ўсё падумаў. І пра цябе думаюць увесь час. І таму тую ўладу трэба падтрымліваць, якая б яна не была.

Але, на шчасце, ужо выросла іншае пакаленне, якое не хоча, каб без іх вырашалі іхны лёс. І гэтае пакаленне ўжо набралася жыццёвага і палітычнага досведу. І яны ўжо гатовы сказаць сваё слова. Вось яна, тая прычына, чаму вяртанне назад у СССР немажлівае, бо сённяшняе жыццё на Беларусі прымушае маладых думаць. А хто думае, той рана ці позна нешта прыдумае.

Віктар САЗОНАЎ

Пра якую свабоду ідзе гаворка? Або інакш, чым з'яўляецца свабода ў такой дзяржаве як ЗША, ці ў такой як Польшча? Фармальна свабода забяспечана законамі, нават і ў Беларусі.

Ці свабода можа быць пакутай?

Чаму свабода, паводле Ежы Плютовіча, становіцца для людзей цяжарам, пакутай — не вядома („Ніва" н-р 6 ад 11.02.2007 г.). Плютовіч абумоўліваецца, што так „бывае", а не заўсёды так ёсць, „што людзі патрабуюць перш за ўсё бяспекі і ладу ў зямным сваім жыцці, бо свабода становіцца цяжарам, пакутай". Невядома чаму аўтар фельетона супрацьпастаўляе бяспеку штодзённага жыцця свабодзе. Гэта два зусім розныя паняцці.

Нават жывёла ў заапарку, якой не пагражаюць паляўнічыя, драпежнікі, голад, калі б толькі магла, уцякла б ад гэтага бяспечнага жыцця чорт ведае куды! А чалавек? Ён горшы за жывёлу з заапарка? Спадар Плютовіч, якіх людзей маеце на ўвазе? Хіба тых, якія нарадзіліся нявольнікамі і проста не ведаюць, не ўяўляюць сабе, што гэта значыць быць свабодным, вырашаць самому свае справы. Не дарма гаворыцца: жыць па-свойму, бо кожны мае сваё адзінае жыццё.

Пэўна. Бывае і так, у экстрэмальных, ваенных умовах, што няма выхаду: або смерць, або няволя. Інстынкт самазахавання не дазваляе гінуць, і таму людзі выбіраюць няволю. Але з другога боку, каб не інстынкт свабоды, то да гэтай пары мы мелі б грамадзян і нявольнікаў, як у старажытным Рыме.

Пра якую свабоду ідзе гаворка? Або інакш, чым з'яўляецца свабода ў такой дзяржаве як ЗША, ці ў такой як Польшча? Фармальна свабода забяспечана законамі, нават і ў Беларусі. Але якая ёсць практыка? Можаш чалавека выбіраць у прэзідэнты Мілінкевіча, Казуліна, Лукашэнку. Выбіраць можаш, але ўлада кажа табе, а мае да таго ўсе рэсурсы, што найлепшым будзе Лукашэнка. Пэўна, што можаш выбраць Мілінкевіча, але не спадзявайся, што будзеш мець працу і т.д.

А затым, калі свабода забяспечаная канстытуцыяй, незалежнымі ад улады судамі, вольнай і незалежнай прэсай, значыць, чалавек павінен быць у такой дзяржаве свабодным, з усімі атрыбутамі свабоды. Можа выказваць голасна свае погляды на розныя справы. Можа крытыкаваць войта або бурмістра, і ніхто яго за гэта не пасадзіць у турму. Можа нават крытыкаваць прэзідэнта, не гаворачы ўжо пра міністра.

У сцвярджэнні Плютовіча „што людзі патрабуюць перш за ўсё бяспекі і ладу" чую рэха мінулай рэчаіснасці, а таксама рэальнасці з-за польска-беларускай мяжы. Старэйшыя чытачы памятаюць як улада гаварыла, што яна перад усім забяспечыць жыццё людзей перад крымінальнікамі, бандытамі, матэрыяльным недастаткам. Кожны грамадзянін будзе мець доступ да працы, асветы, адпачынку. Як выйшла на практыцы — вядома. Перш за ўсё ўлада забяспечвала сябе і сваіх памагатых. Цяперашняя ўлада зусім не лепшая. Такая ўжо натура ўлады. Праблемай ёсць тое, каб абмежаваць памкненні ўлады да валодання ўсім і ўсімі. У таталітарызме, або іншым -ізме наогул адсутнічае абмежаванне ўлады. У дэмакратыі сіла ўлады залежыць ад грамадзянскай свядомасці людзей і канструкцыі самой дэмакратыі як сістэмы.

На пачатку ІІІ Рэчы Паспалітай у Махнатым не было выбараў радных, таму што для кандыдатаў на радных у гміну не было канкурэнцыі. Зараз адбываюцца аўтэнтычныя дэмакратычныя выбары. Махначы заўважылі, што ад іх голасу залежыць хто будзе кіраваць гмінай, а затым ад іх сяміх залежыць забеспячэнне сваіх інтарэсаў.

Міхал КУПТЭЛЬ

Вачыма еўрапейца

Кур'ёзны выбар

У XX стагоддзі Чэслаў Мілаш аказаўся быць тым для польскай паэзіі і культуры, кім у XIX стагоддзі быў Адам Міцкевіч. Дзіўная паўторнасць лёсу двух вялікіх палякаў. Абодва яны называюць сваёй айчынай Літву і лічаць сябе ліцвінамі — у даўнім сэнсе гэтага слова, калі азначала яно грамадзяніна колішняга Вялікага княства Літоўскага, — пісаў пасля смерці польскага лаўрэата Нобелеўскай прэміі літоўскі паэт, перакладчык і гісторык Томас Венцлова. Вочы Чэслава Мілаша заўжды былі звернуты на ўсход Польшчы і далей, не толькі на яго Літву. Іншы Вялікі паляк, стваральнік і выдавец парыжскай „Культуры", які публікаваў творы Чэслава Мілаша — Ежы Гедройц, прымаючы прысвоенае яму ў 1998 г. званне доктара *honoris causa* Універсітэта ў Беластоку, гаварыў: „Уся наша актуальная палітыка накіравана выключна на Усход. Ды, каб пераканаць свет і саміх сябе, што мы прыналежым Еўропе, мусім мець ясную ўсходнюю палітыку, мусім разумець, што павінны быць буферам гэтых двух светаў, паколькі наша пазіцыя на Захадзе будзе мерацца нашай роляй на Усходзе". Адзначыў ён яшчэ: „Вядучым пытаннем з'яўляецца праблема Беларусі". Дарэчы, беларуская праблема, у шырокім значэнні, у паглядзе на абодва бакі мяжы была блізкая Чэславу Мілашу, мабыць, таксама з прычыны таго пажыццёвага пачуцця прыналежнасці да Вялікага княства Літоўскага.

Успамінаю двух гэтых Вялікіх, паколькі ў апошні час беластоцкія ўлады разважаюць, якім імем назваць адну з вуліц сталіцы рэгіёна, якая будзе месціцца на будаваным якраз Капернікансім шляху, паміж вуліцамі Браніцкага і Міцкевіча.

Пры дапамозе прэсы наладжаны быў таксама дзіўны плебісцыт, які зводзіўся да пытання хто з іх — Мілаш ці Гедройц — больш варты гэтага... вылучэння. У адной з газет віцэ-прэзідэнт Міхал Вяжбіцкі заявіў:

— Прымаем пад увагу некалькі канцэпцый, як назваць гэтую вуліцу. Разважаем, між іншым, ці даць ёй імя Чэслава Мілаша. Я, аднак, ведаю, што нейкі час таму гэтая ідэя выклікала ў некаторых грамадскіх колах рознагалоссе, таму лічу, што вырашэнне гэтай справы трэба пакінуць жыхарам Беластока. Таму чакаем розных выказванняў наконт гэтага пытання.

Зандзіраванне грамадскай думкі ў гэтай справе мае невялікі сэнс, паколькі рашэнне ў справе назваў вуліц у кампетэнцыі радных Гарадской рады. З большасці іх выказванняў вынікае, што яны бліжэй увекавечання памяці Чэслава Мілаша. Прагучалі нават выказванні, што Ежы Гедройц ужо ў Беластоку ўшанаваны: яго імем назвалі Універсітэцкую бібліятэку. Думка іншых такая, што імя Ежы Гедройца малавядомае, а Чэслаў Мілаш гэта „ўсё ж адзін з найбольш вядомых у свеце паэтаў".

Аднак, на маю думку, абсалютнай бязглуздзіцай з'яўляецца спроба ацэнкі гэтых несумненна вялікіх аўтарытэтаў шляхам прысваення імя аднаго з іх беластоцкай вуліцы. Можна паставіць пытанне: чаму і Мілаш, і Гедройц не могуць мець сваіх вуліц у Беластоку? І застаецца яшчэ адно пытанне: колькі вялікіх і забытых беластачан не маюць, а павінны мець, вуліц свайго імя? А гэтых вуліц неўзабаве будзе шмат, што прадбачваюць сённяшнія ўлады. А ёсць такія беластачане, якіх лёс раскінуў па свеце, і неабавязкова яны польскага паходжання. Да таго, калі ў Беластоку значнай групай жыхароў з'яўляюцца беларусы, то чаму ж не пашукаць беларускіх беластачан, якіх імя вартае вуліцы, а нават і не адной, бо і такое магчымае.

Незалежна ад таго, як будзе з адной ці іншай назвамі беластоцкіх вуліц, заўжды варта памятаць аб тым, што сказаў калісьці Леў Талстой: „Вера ў аўтарытэты мае такі ўплыў, што памылкі аўтарытэтаў успрымаюцца як узор".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Каб пакарыстацца еўрасаюзнымі сродкамі

Размова з Янам ХОМЧУКАМ — дырэктарам бюро Аб'яднання самаўрадаў Еўрарэгіёна „Белавежская пушча".

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дырэктар Ян Хомчук кіруе ў бюро Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" калектывам з 6 чалавек (у тым ліку 3 асобы дапамагаюць у рамках валанцёрства)

— Еўрарэгіён „Белавежская пушча" быў створаны толькі ў 2002 годзе і з'яўляецца адным з самых малых еўрарэгіёнаў, якія ахопліваюць частку тэрыторыі Польшчы. Аднак апошнім часам штораз больш праектаў фінансаваных з еўрасаюзных сродкаў праходзіць праз Вашае бюро і рэалізуецца на прыпушчанскай тэрыторыі.

— У 2004 годзе мы раздзялілі 50 тысяч еўра на рэалізацыю 5 праектаў. У 2005 і 2006 гадах размеркавалі мы ўжо 240 тысяч еўра на чарговыя 22 ініцыятывы, а ўсё рабілі ў рамках Фонду малых праектаў PHARE. Усе прапановы, якія атрымалі дафінансаванне, былі „мяккімі" праектамі і прадбачвалі арганізацыю разнародных культурных, прыродазнаўчых ці турыстычных мерапрыемстваў. Ладзіліся таксама семінары і сустрэчы, якія мелі ўспамагаць развіццё дэмакратыі, але заўсёды мусіла адбывацца трансгранічнае супрацоўніцтва паміж жыхарамі Польшчы і Беларусі.

— Ці гэтыя мерапрыемствы ладзіліся толькі на тэрыторыі Еўрарэгіёна „Белавежская пушча"?

— Так, спачатку праекты рэалізаваліся на тэрыторыі нашага еўрарэгіёна, у састаў якога ў Польшчы ўваходзяць Гайнаўскі павет ды ўсе гміны Гайнаўскага павета, Арлянская і Бельская вясковая гміны. У Беларусі да еўрарэгіёна належаць Пружанскі, Камянецкі і Свіслацкі раёны.

— Аднак хутка сродкі да выкарыстання і тэрыторыя рэалізацыі праектаў выдатна павялічыліся.

— Да падзелу ў 2005 і 2006 гадах мы атрымалі таксама новыя, намнога большыя ад папярэдніх сродкі ў рамках праграмы Суседства Польшча-Беларусь-Украіна INTERREG III A/Tacis CBC і было гэта больш за 700 тысяч еўра. Тэрыторыя, на якой ладзіліся мерапрыемствы, была пашырана ў Польшчы, Беларусі і ахапіла частку Украіны. Што тычыцца Польшчы, дык праекты маглі рэалізавацца на тэрыторыі Гайнаўскага, Бельскага і Сямятыцкага паветаў Падляшскага ваяводства і 4 паветаў Мазавецкага ваяводства.

— Вы не назвалі Беластоцкага і іншых паветаў Падляшскага ваяводства.

— Арганізацыі зарэгістраваныя, напрыклад, у Беластоцкім павеце маглі ладзіць мерапрыемствы на тэрыторыі Гайнаўскага або Бельскага паветаў з нашых сродкаў, а калі хацелі рэалізаваць праекты, напрыклад, у Беластоку, мусілі выступаць за дафінансаванне ўжо ў Еўрарэгіён „Нёман".

— Калі пералічыць узгаданыя Вамі грошы на залатоўкі, атрымліваецца пад 3 мільёны злотых. Якія большыя мерапрыемствы ладзілі нашы арганізацыі або ўстановы за еўрасаюзныя сродкі?

— Беларускі самаўрадавы форум з еўрасаюзным дафінансаваннем выдае часопіс „Па-суседску". Аб'яднанне Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы рэалізавала праект, у час якога збіраліся легенды, паданні і іншыя матэрыялы з мінулага Польшчы і Беларусі, якія ўвайшлі ў кніжку „Забытых таямніцаў чар", выдадзеную на еўрасаюзныя сродкі. Саюз любіцеляў царкоўнай музыкі ладзіў на Гайнаўшчыне мерапрыемствы, якія спадарожнічалі Міжнароднаму фестывалю царкоўнай музыкі. Аднак нашы няўрадавыя арганізацыі былі ў вялікай меншасці. Найбольш праектаў рэалізавалі гарадскія і гмінныя дамы культуры. Напрыклад, у рамках дзвюх праграм ладзілася „Купалле" ў Белавежы і Нараўцы. Многа было мерапрыемстваў, дзе прэзентавалася беларуская культура і даўнія традыцыі. Арганізатары праектаў звярталі ўвагу на захаванне мовы, нацыянальнасці і тоеснасці беларусаў і іншых нацыянальнасцей. Частка праграм тычылася праваслаўнай спадчыны. Фінансаваліся таксама экалагічныя праекты.

— Некаторыя жыхары Беларусі, якія прыязджаюць у Польшчу ў рамках узгаданых праектаў, раней не мелі нагоды паглядзець на жыццё за мяжой і яны вельмі рады выездам. Як у цэлым складваецца супрацоўніцтва з загранічнымі гасцямі?

— На маю думку супрацоўніцтва з партнёрамі з Беларусі і Украіны складваецца добра. Хаця беларускія і ўкраінскія чыноўнікі хацелі б, каб іх раённыя саветы мелі ўздзеянне на размеркаванне сродкаў і падборку партнёраў да супрацоўніцтва з іх боку. Аднак ідэя ў Еўрасаюзе ёсць такая, каб дзякуючы супрацоўніцтву разгарнулі сваю дзейнасць перад усім няўрадавыя арганізацыі з Беларусі і Украіны і гэта яны найчасцей з'яўляюцца галоўнымі партнёрамі да супрацоўніцтва. Частка праектаў тычылася маладых людзей, а ў Беларусі і на Украіне неахвотна пускаюць моладзь на загранічныя выезды ў час вучобы. Многія вучні мусяць чакаць зімовых або летніх канікул, каб адправіцца ў Польшчу, а ў час летніх канікул у школах няма нашых дзетак і моладзі і таму часам цяжка наладзіць супольныя сустрэчы. Бываюць таксама праблемы з атрыманнем загранічных візаў.

— Вы расказваеце аб праектах, на якія сродкі ўжо размеркаваны. Ці арганізацыі, у якіх ёсць цікавыя ідэі, могуць яшчэ звяртацца да Вас за дафінансаванне сваіх прапаноў?

— Некаторыя праекты, на якія мы раздзялілі апошнюю траншу сродкаў, ужо зрэалізаваныя, а іншыя будуць ажыццяўляцца ў 2007 годзе. Ёсць яшчэ праекты на дадатковым спіску, якія будуць фінансавацца з нашых зберажэнняў. Аднак мы прадбачваем атрымаць у другой палове 2007 года чарговыя сродкі на малыя праекты ў рамках Еўрапейскага інструмента суседства і партнёрства Польшча-Беларусь-Украіна, на 2007-2013 гады. Зараз ідуць яшчэ кансультацыі па гэтай справе і калі будуць нам прызначаны сродкі для размеркавання, можна будзе выступаць за імі розным арганізацыям.

— У школах, дзе адбываецца навучанне беларускай мовы, ладзяцца розныя беларускія мерапрыемствы. Якія прапановы з іх боку могуць атрымаць дафінансаванне?

— Гайнаўскія школы, дзе вядзецца адукацыя на беларускай мове, выступалі ўжо да нас з праектамі па супрацоўніцтве з Беларуссю, а апошнім часам з Беларуссю і Украінай ды атрымлівалі дафінансаванне. Школы могуць выступаць да нас з новымі прапановамі, але трэба ім памятаць аб трансгранічным супрацоўніцтве. Могуць ладзіцца таксама сустрэчы настаўнікаў або бацькоўскіх камітэтаў у рамках праектаў з еўрасаюзным дафінансаваннем.

— Калі нейкія беларускія арганізацыі рашацца выступіць да Вас за сродкамі ў гэтым годзе, на што павінны звяртаць увагу, рыхтуючы свае праекты, каб яны маглі атрымаць высокую ацэнку?

— Перад усім павінна быць супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, за якое можна атрымаць ажно 20 балаў, на 100 магчымых. Важная таксама роля загранічных партнёраў і іх ангажаванасць, за што можна атрымаць таксама ажно 15 балаў. Мы звяртаем таксама ўвагу на выданні, у якіх будуць падведзены вынікі рэалізацыі праектаў, напрыклад, на альбомы ці буклеты. Важна таксама, каб арганізацыі, якія будуць выступаць да нас з праектамі, маглі пахваліцца вопытам у ладжанні мерапрыемстваў.

— Ці вялікі ўласны ўклад павінны падрыхтаваць арганізацыі?

— З еўрасаюзных сродкаў фінансуецца 75% коштаў праектаў. Але на 25% уласнага ўкладу можна яшчэ атрымаць 10-працэнтнае дафінансаванне з бюджэтнага рэзерву нашай дзяржавы і многія арганізацыі карысталіся гэтай прывілеяй. У лік апошніх 15% коштаў праектаў можна ўключыць бясплатную працу, гэта значыць валанцёрства, бясплатнае выкарыстанне памяшканняў або музычнай апаратуры. Трэба аднак мець свае сродкі, каб распачаць рэалізацыю праекта, бо зараз вяртаем мы грошы этапамі, толькі пасля рэалізацыі нейкага мерапрыемства, калі можна фактурамі пацвердзіць выдаткаваныя грошы. Можа таму меншым арганізацыям, з невялікімі бюджэтамі, цяжка раздабыць сродкі, каб разгарнуць праекты.

— Калі аднак прыйдуць да Вас жыхары нейкага сяла, якія схочуць нешта зрабіць у сябе, ці могуць яны разлічваць на фінансавую дапамогу, без супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі?

— Ёсць яшчэ іншая праграма па актывізацыі мясцовага грамадства. Аднак сродкі, якія можна ў рамках яе раздзяліць, невялікія. У 2006 годзе было да падзелу толькі 35 тысяч злотых, а ў 2007 годзе раздзелім 32 тысячы злотых і ў сярэднім актыўныя групы людзей атрымліваюць толькі пад 3 тысячы злотых. Жыхары Гайнаўскага павета і вясковых гмін Орля і Бельск-Падляшскі, якія хочуць пакарыстацца гэтай дапамогай, павінны спачатку атрымаць паручыцельства зарэгістраванай арганізацыі, у якой ёсць банкаўскі рахунак.

— На якую дзейнасць рашаліся нефармальныя групы, якія выступалі да Вас за сродкі на грамадскую актывізацыю?

— Напрыклад, жыхары Райска ліквідавалі звалкі смецця ў прыдарожных равах і парадкавалі наваколле дарогі. Людзі з Дубін хацелі выступіць за сродкі на парадкаванне могілак, але канчаткова не пакарысталіся нагодай дафінансавання іх дзейнасці.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Нашы солтысы

У апошні час адбываліся выбары солтысаў. Я хачу нашым чытачам прадставіць Андрэя Ліпато, саракагадовага жыхара вёскі Гусакі што на Бельшчыне, каля Райска, які быў паўторна абраны солтысам.

Вёска Гусакі налічвае каля 90 хатаў. Маладых тут як на лякарства, прыязджаюць яны наведваць сваіх бабуль і дзядуляў у час канікулаў ці па святах. У вёсцы ёсць крама, пункт скупкі малака. Сям'я Андрэя жыве ў новым прыгожым доме. Навокал парадак, летам многа кветак. Жонка Марыёля скупляе малако ў вёсцы, дачушкі Кася і Уршуля вучацца ў Пачатковай школе ў Ягуштове, а сын Пятро ў Лясным тэхнікуме ў Белавежы. Зацікаўленні Андрэя гэта пчалярства, гаспадарка і майстраванне. Яго называюць „залатой ручкай". Прафесійна працуе ён пажарнікам у Павятовай камендатуры пажарнай стражы ў Бельску-Падляшскім.

Сваім дасягненнем Андрэй лічыць рамонт святліцы ў сваёй вёсцы, рамонт дарогі ў Райск і ў напрамку шашы ў Бельск. Цяпер ён будзе старацца, каб адрэзак дарогі ад сяла да шашы быў заліты асфальтам. Жыхары вёскі звяртаюцца да яго з рознымі справамі і ён нікому не адмаўляе ў дапамозе па меры сваіх магчымасцей. За тое, што Андрэй выдатна служыць сваёй грамадскасці, застаецца яму падзякаваць і пажадаць добрага здароўя ды далейшых поспехаў.

Жэня МАРТЫНЮК

КОНКУРСЫ

Нараўчанская зямля

Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі арганізавала конкурс пад загалоўкам „Нараўчанская зямля вачыма пакаленняў". Можна даслаць рэпартаж, апавяданне, эсэ, фотаздымкі, хроніку або намаляваны мастацкі твор. **Тэрмін: да 15 мая 2007 года. Працы прымае Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы, вул. Новая, 3 А.** Дэталёвую інфармацыю можна атрымаць у ГАК ды па тэлефоне 085 685 80 34 ад панядзелка да пятніцы ад 10 да 18 гадзіны.

Найпрыгажэйшыя сялянскія сялібы

Войт Нараўчанскай гміны ды Камісія па грамадскіх і сацыяльных справах Рады гміны ў Нараўцы арганізуюць конкурс „На найпрыгажэйшы вясковы агародчык і панадворак". Заявы аб удзеле ў конкурсе прымае Гмінная ўстанова і Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы **да 15 чэрвеня 2007 года.** Запрашаем усіх ахвотных.

Уручэнне ўзнагарод пераможцам адбудзецца на сёлетняй восеньскай сесіі Рады гміны ў Нараўцы.

(мох)

Так толькі ў Чаромсе...

Аб чыгуначнай Чаромсе, а канкрэтна аб Чаромхаўскай гміне, пісалася шмат у беластоцкіх СМІ, асабліва ў час выбарчай кампаніі ў мясцовае самакіраванне. Не стану вяртацца да мінулага, але засяроджуся на апошніх паслявыбарчых падзеях, вынікам якіх стала тое, што на пасаду войта чарговы раз быў выбраны Міхал Врублеўскі, які застаецца на пяты тэрмін паўнамоцтваў. У новую Раду гміны ўвайшло пятнаццаць дэпутатаў, у тым ліку дванаццаць „новых". Старшынёй Рады гміны была выбрана Надзея Суліма, настаўніца-пенсіянер, старшыня Таварыства „Прыязны транспарт", а яе намеснікам — Часлава Вілюк, санітарка з Пачатковай школы. Абедзве дамы актыўна ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі на карысць войта і з-за таго, па маёй думцы, атрымалі зараз належную пашану. (Навінкай стала тое, што сёлета намесніку Рады гміны ўпершыню прызначылі 320 зл. штомесячнай платы). Новая Рада адмысловай пастановай вярнула 250 зл. ранейшага ліміту (абмежаванага Радай папярэдняга скліканя) войту за карыстанне прыватным транспартам пры выкананні службовых абавязкаў на тэрыторыі гміны. Такім чынам выдаткі на гмінную адміністрацыю павысяцца ў гэтым годзе на 6 840 зл. Ды не адзін гэта прыклад увелічэння коштаў адміністрацыі. Штораз часцей бачым новыя твары ў кабінетах. Гаворка ідзе, што быццам бы выпускнікі праходзяць тут стажыроўку, але адно Усявышняму вядома, якая праўда. Зараз кажуць, што ў фірмах вярхушку трымаюць „сямейныя клады". Так і ў Чаромсе справа маецца. Увелічэнне штатаў гміннай адміністрацыі гэта адзін бок медаля. Горш справа маецца з другім — з кампетэнцыямі апошніх.

Пачатак Чаромхі з боку Кузавы

У Чаромхаўскай гміне знаходзяцца два салэцтвы з аднолькавай назвай Чаромха. Мясцовым не цяжка разабрацца ў справе, але ў прыезджых, як і ў службовых паперах па гэтай прычыне ўзнікаюць праблемы. Затым хтосьці прыдумаў такое: першую Чаромху — з чыгуначнай станцыяй — назваць „пасёлкам" (асадай), а другую — Чаромхай-Вёскай. Такія назвы па сённяшні дзень знаходзяцца на ўказальніках. Мала таго. На круглых пячатках гмінных установ, Пачатковай школы і Гімназіі (з гербам дзяржавы) віднее надпіс: Czeremcha Osada. Як мне вядома, Чаромха ніколі не была „асадай", так як Белавежа, Нарва, Нараўка ці Нурэц. Калі справа тычыцца Нурца, дык гмінныя чыноўнікі для адрозненя ад аднайменнай вёскі дадалі слова „станцыя". І нікога не здзіўляе, што афіцыйна пішацца: Гмінная ўправа Нурэц-Станцыя. Чаму пра такое ў Чаромсе не падумалі? Цяжка на гэтае пытанне адказаць, бо і віноўнікаў няма. Калі я паспрабаваў высветліць гэта на сесіі Рады гміны, дык ад загадчыцы ЗАГСа Аліцыі Пытэль пачуў такі адказ: „Справа нам вядомая. У 2004 годзе памянялі мы пячаткі і зараз напісана на іх адно Чаромха без прыпіскі «Асада». Мне стала вядомым, — працягвала яна, — што ў цэнтральным спісе мясцовасцей ніколі не было Чаромхі-Асады, а толькі Чаромха. Адно такая назва была ўведзена ў электронную сістэму PESEL недзе ў 1980-х гадах. Хто ўвёў такую назву, ды на аснове якіх дакументаў, мне невядома".

А гэта ўжо ў Чаромсе-Вёсцы

Ва ўсім гэтым закалоце здзіўляе мяне адно: якім чынам Ваяводская ўправа ў Беластоку магла прапусціць такую памылку? Дзе былі мясцовыя кіраўнікі гміны ў 1990 годзе, калі ўступаў у сілу закон аб тэрытарыяльным самаўрадзе? А мо звычайна не ацанілі належным чынам праблему, якую прыйдзецца калісьці вырашыць? Калі я справу паставіў на сесіі 11 красавіка, дык старшыня Рады гміны паставіла мне пытанне: „Што для нас зараз важнейшае, пан Сідарук, мяняць указальнікі з назвай мясцовасці, ці будаваць дарогі?" Прызнаюся шчыра, што я не рашыўся працягваць недарэчную палеміку, паколькі зразумеў, што кіраўнікі Чаромхаўскай гміны не бачаць у гэтым праблемы. А мне здаецца, што яна павінна быць неадкладна вырашана. Затым хачу паставіць пытанне ваяводу: „Што будзе з дакументамі, выдадзенымі Гміннай управай ды Пачатковай школай і Гміннай гімназіяй у Чаромсе апячатанымі круглай пячаткай з гербам дзяржавы і надпісам „Чаромха-Асада", калі выявіцца, што такой мясцовасці ў Польшчы не было?" А войта гміны пытаю: „Ці жыхарам Чаромхі (пасля адмянення пячатак у 2004 г.) выпраўлены ўжо дакументы з актуальнай прапіскай, а калі не, дык хто за гэта нясе як службовую, так і фінансавую адказнасць?"

Тут канчаецца Чаромха з дарогай у Вульку-Тэрахоўскую

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

PS. Як мне сказаў жыхар вуліцы Тапалёвай Уладзік С., у ягоным пашпарце дагэтуль запісана, што ён пражывае ў Чаромсе-Асадзе.

Жыровічы — частачкі нёба на зямлі!

— 2 —

Ці кожны можа спыніцца ў Жыровічах?

Прачыстая Багародзіца ўсіх прымае!

Такія словы можна прачытаць у буклеце, прысвечаным Жыровіцкаму манастыру. Тэарэтычна, сапраўды гэта так. Аднак, каб рэальна і практычна спыніцца ў манастыры ды насыціцца яго святым духам, неабходнае бласлаўлення. На фортачцы каля будкі дзяжурнага бачу шыльдачку: *Без благословения вход запрещен!*

Спачатку кіруюць мяне да айца Сільвестра, які асабіста разважыць маю просьбу і вырашыць ці астануся за муром.

Ужо раней мяне папярэдзілі, каб, крый Пане Божа, не называць тут духоўных асоб нашай польскай „царкоўнай" тэрміналогіяй: *proszę księdza.* Шкада, што не папярэдзілі мяне і ў справе прывітання. На маё „Слава Ісусу Хрысту!" запанавала клапатлівае маўчанне. У канцылярыі глядзелі на мяне прынцыпова ласкава, аднак падазрона. Нейкі час я была вымушана чакаць у другім канцы калідора. Я стаяла і гадала: адкуль тут сумненні — чаму не інфармуюць мяне адкрытым тэкстам?! Пасля знаёмы патлумачыў, што нашае „Слава Ісусу Хрысту" — гэта уніяцкі рэлікт (даслоўнае тлумачэнне лацінскага: *Laudetur Jesus Christus*). Ён сам аднойчы перажыў паразу на грунце царкоўнай дыпламатыі. Паколькі кожны кантакт журналіста з духоўнай асобай патрабуе тут бласлаўлення іерархаў, знаёмы быў вымушаны пазваніць у канцылярыю мітрапаліта. Вядома, стараўся. Ён прывітаўся заведзеным у нас: *Слава Ісусу Хрысту!*

— Да? — адказалі яму ў трубцы.

Мне таксама адказалі „да". Хоць у маім выпадку гэта абазначала згоду на трохдзённую пабыўку за мурам. У тым ліку мне даравалі начлег і харчаванне. На журналісцкую працу, хаця б на адзін фотаздымак, я патрабавала асобнага бласлаўлення.

* * *

Нават у самыя змрочныя гады ваюючага атэізму ў Жыровічы цягнулі паломнікі. Слава цудадзейнай іконы прыцягвала ўжо з канца XIV стагоддзя. На сучасных іконах Цудоўнага паяўлення іконкі цяжка здагадацца якое там дрэва. Напамінае яно кіпарыс, пальму, вярбу або хвойку. Папраўдзе, іконка, велічынёй дзіцячай жменькі, паказалася на грушы. Дрэва расло ў падножжы гары, адкуль выцякала крыніца. Яшчэ ў дахрысціянскай міфалогіі груша выконвала ролю дрэва-ахоўніка. На ім знаходзілі ўтулле ўцекачы, ахвяры праследаў ды злачынстваў. Міфалагічная груша давала эфект нябачнасці — быццам плашч-няўгледка. Цікава, што першымі пабачылі яе дзеці. Пра пачатак культу чытаем такую легенду:

Ёсць год 1470. Дзеці-пастушкі бачаць на грушы святло, якое б'е ад каменнай іконкі. Нясуць яе свайму пану, Аляксандру Солтану. Той спачатку скептычна адносіцца да расказаў дзяцей, аднак прымае ад іх ікону і кладзе яе ў сваю скрытку. Праз дзень у яго госці. Гаспадар хоча пахваліцца рэдкай знаходкай. Аднак калі адкрывае скрытку, там чамусьці іконы няма. Праз некалькі сутак дзеці зноў знаходзяць на грушы іконку. Зноў прыносяць яе Солтану. Зараз і ён пачынае верыць у цуд. На месцы з'яўлення праваслаўны магнат узводзіць царкву.

Сястра Зінаіда

Весткі пра здарэнне маланкава абыходзяць Вялікае княства Літоўскае. З усіх куткоў Беларусі хлынуць паломнікі. Ёсць звесткі пра адно ўваскрэсенне з мёртвых.

* * *

Калі я ехала ў манастыр, думала: тут адпачну ад мабільнікаў.

З канцылярыі айца Сільвестра направілі мяне ў Дом паломніка. Тут жа, па мабільніку, „пасялілі" мяне ў гасцініцы. На месцы прывітала мяне сястра Зінаіда.

— Калі ласка, здыміце боты, — загадала на прывітанне. Яе дзелавы, суровы тон дзейнічаў як загад. З другога боку — усё лагодзіла добрае і натхнёнае спакоем аблічча сястры.

Пасялілі мяне ў *лутчым* корпусе гасцініцы, у прасторным пакоі на сем ложак.

Адразу сятра Зінаіда пачаставала мяне кавай і цукеркамі. Хоць у пакоі ўсе месцы былі свабодныя, сястра параіла мне заняць найменш зручны ложак.

— А тут, — паказала яна на самы выгодны ложак ля стала, — начуюць найбольш хворыя.

Пасля ў рух пайшлі тэлефоны. Сястра поўнасцю занялася арганізацыяй маёй пабыўкі, кожнай сустрэчы. І, каб атрымаць на ўсё бласлаўлення, патраціла яна сапраўды многа часу.

Я атрымала бласлаўлення на сустрэчу з інакам Мікалаем. Тут жа мы дамовіліся на сустрэчу, вядома, па тэлефоне...

* * *

Каля 1520 года першая драўляная царква, узведзеная Солтанам, згарэла датла. Разам загінула і цудоўная ікона. Аднак неўзабаве яна зноў паявілася побач месца пажару. У гэты раз з'явілася сама Божая Маці. Багародзіца зноў паявілася вясковым дзецям. Яна стаяла на камені з іконкай у руцэ. Як ні глядзець на гэты апошні цуд, ён грунтоўна ўпісваецца ў дахрысціянскі культ камянёў на тэрыторыі Беларусі.

Камень адразу абгарадзілі і ў 1672 годзе над ім была ўзведзена царква Нараджэння Божай Маці, вядомая ў народзе як Яўленская. Камень, велічынёй валуна, памешчаны ў алтары пад прастолам.

Сёння ікона знаходзіцца ў Свята-Успенскім саборы, па правым баку ад іканастаса. Святыня выяўляе сабой авал з яшмы з рэльефным выяўленнем Багародзіцы з Прадвечным Дзіцяткам на руках, яе размер — 5,6 х 4,4 см. Выяўленне адносіцца да тыпу „Уміленне". І хоць яно мае простыя абрысы, з першага погляду на ікону астаецца ўражанне вытанчанасці і глыбіні. Трэшчыны на абразе напамінаюць пра пажар, у якім яна пабывала. Святыня лічыцца нерукатворнай, карацей, яна не створана рукой чалавека...

Цудоўная ікона Жыровіцкая Божай Маці аб'явілася ў 1470 годзе

(працяг будзе)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Як чыталі па — царкоўнаславянску

22 сакавіка г.г. у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы адбыліся павятовыя элімінацыі X Турніру чытання царкоўнаславянскіх тэкстаў для школьнай моладзі. Конкурснай камісіі старшынстваваў айцец мітрат Міхал Негярэвіч.

У катэгорыі пачатковых школ найлепш зарэкамендавалі сябе Юстына Амельянюк (першае месца), Мірон Марчук (другое месца) і Давід Якубоўскі (трэцяе месца). Вылучэнне атрымалі Паўліна Хвойка і Маргарыта Гаворка.

Сярод гімназістаў першае месца заняла Юстына Пікуцін, другое — Іаанна Шаўкала і трэцяе — Барбара Струк. Вылучэнне атрымалі Юліта Плева, Анна Нядзельская і Юстына Харкевіч.

У катэгорыі сярэдніх школ першынство заваяваў Кшыштаф Гапанюк, які апярэдзіў Кшыштафа Кудэрскага і Марыю Астраверх. Два вылучэнні атрымалі Паўліна Скепка і Анна Раманюк.

Усе, хто заняў I, II і III месцы, возьмуць удзел у цэнтральных элімінацыях турніру.

Конкурс арганізавалі Мітраполія ПАПЦ, Дэканальны інстытут праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы ды метадычны дарадчык навучання праваслаўнай рэлігіі Ліля Буслоўская з Гайнаўкі.

(мох)

Наша кулінарыя

Колішняя вясковая каўбаска,
Што гатовілі Надзя з Параскай,
Мела свой смак бездакорны
І арамат непаўторны.

Кумпяк, гартаваны дымам,
На смак меў ён марку „прыма"!
І вялены жонкай стараннай
Таксама быў беззаганны.

Кумпяк так мог вісець паўгода —
Такая была тады „мода",
Такі быў тады „халадзільнік"
У цёмнай каморы „хадзіў" ён.

Калі ж была гаспадыня,
Што сем гародаў — адна дыня,
У кумпяк пасяляліся чэрві,
А ў хату завітвалі нервы.

А ж нашу крывяную кішку
Уплятаці не толькі Грышкі.
Усім яна нос казытала
І страўнік мігом напаўняла.

А нашы сланінка, грудзінка
На смак былі як малінка —
Так жонкі мужам дагаджалі,
У сэрцайка шлях пракладалі.

І кожны свініны кусочак,
У страве знаходзіў куточак.
Так дбалі пра ўсё гаспадыні,
Ашчадна ўсім даражылі.

А зараз у купнай вяндліне
Вадзічкі больш палавіны,
Ядзім разам з ёй хімікаты...
І меншае ўсё парасятак.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота Ганны Кандрацюк

Лотаць

Цёплы ветрык разгуляўся,
Па лугах-палях прамчаўся,
Дрэвам косы расчасаў,
Лісце ў росце падагнаў,
Перабегся па лугах,
Хвалі зморшчыў у ручаях
І стаіўся ў захапленні,
Быццам стаўшы на калені:
Жоўтыя як качаняткі,
Што адбегліся ад маткі
На лугу ля рова кветкі,
Залатыя бы манеткі,
З зелені цікуюць вочкам
Пад жаўранкавым званочкам.

Міра Лукша

Белавежскія расказы

СЫНОК ЗАБІЯКА

Фота Ганны Кандрацюк

Калі мне было столькі гадоў, як зараз вам, дзеці, маці павесіла над маім ложкам дыванок, вышыты ўручную. На зрэбнай тканіне плылі па блакітнай вадзе сярод чароту белыя птушкі з прыгожа выгнутымі доўгімі шыямі.

— Гэта — лебедзі, — сказала матуля. — Найпрыгажэйшыя на свеце птушкі.

І я, малая, кладучыся спаць, усё глядзела на гэтыя таямнічыя казачныя істоты, якіх у нашым краі не назіралася.

Прайшло шмат часу і аднойчы на рацэ Лясной у Белавежскай пушчы я ўбачыла грацыёзных, бялейшых за снег, сапраўды, найпрыгажэйшых на свеце лебедзяў-шыпуноў. Яны плылі па сапраўднай вадзе і нагадвалі мне такое далёкае мілае дзяцінства. Я была зачаравана іх стройнымі постацямі, іх даверлівасцю: яны падплывалі да берага, бралі кінуты ім хлеб і гэтак жа горда адплывалі. Усе замілавана сачылі за рэдкай у нашым кутку птушкай.

Мінула яшчэ колькі гадоў і лебедзі пасяліліся на многіх вадаёмах пушчы. Неяк жыхар Камянюк Валянцін Тарасевіч вяртаўся з лесу дадому. Быў пачатак лета. Раптам ён заўважыў малое белае птушаня, якое заблыталася ў зараслях травы і ледзьве дыхала. Бацькоў ягоных нідзе не было відаць. Шкада стала чалавеку бездапаможнае птушаня, ён хуценька дастаў з вады небараку, захінуў яго крысом камізэлькі і панёс дадому ратаваць ад драпежнікаў і голаду. На той час ягоная гуска вывела цэлы выводак гусянят, і, не доўга думаючы, гаспадар падсадзіў лебедзяня да маці-гускі. Яна прыняла малое. Разам вадзіла прыёмнага сыночка са сваімі дзеткамі на вадаём, клапацілася аб ім.

Пакуль „сынок” пад стол пешшу хадзіў, ён дазваляў браць сябе на рукі, ласкавы быў. Так і назвалі яго — Сынок. Але ішоў час і з „агіднага качаняці” лебедзяня ператварылася ў прыгожую моцную птушку. Стаў Сынок свае парадкі ладзіць на гаспадарскім двары: разагнаў курэй, прыняўся за сваіх зводных братоў-гусей. Прыйшлося і іх тэрмінова адсяляць у другі хляўчук. На гэтым навядзенне „шмону” не скончылася. Пачаўшы з пярнатых, ён узяўся за млекакормячых. Цяпер і каты не толькі суседскія, але і свае баяліся набліжацца да двара. Сабакам спуску не даваў. А калі хто з суседзяў набліжаўся да веснічак, Сынок так шыпеў і грозна распускаў крылы, гатовы ў атаку, што нават самы адважны не рашаўся ступіць за вароты. Найперш зычна клікалі гаспадара, каб той утаймаваў лебедзя.

Спачатку гэта радавала і забавіла гаспадароў: няпрошаны госць у хату не зойдзе і сабака непатрэбны. Але потым Сынок прыняўся і за гаспадароў. Аднаго разу спадар Валянцін прыйшоў дадому пад хмяльком. Ці то яго няўпэўненая паходка насцярожыла лебедзя, ці выгляд не спадабаўся, але Сынок з шыпеннем кінуўся на яго, і стаў не пускаць на ганак. Раззлаваны гаспадар прыгразіў тады адкруціць яму голаў. Ды толькі пазлаваўся Валянцін і на тым годзе: не змог бы пакрыўдзіць птушку, бо палюбіў ён Сынка, прывязаўся да яго ўсёй душой. Праўда, цяпер асцерагаўся прыходзіць дахаты „пад градусам”. Жонка смяялася: „Так ты хутка поўным цвярэзнікам станеш”.

Чым гэтая гісторыя скончылася б, не ведаю, але аднойчы восенню пачуў наш лебедзь высока ў небе галасы сваіх родных братоў і сясцёр. Магутныя прыгожыя птушкі ляцелі над вёскай у накірунку на поўдзень. У адзін момант узмахнуў ён белымі крыламі і паляцеў услед за імі ў далёкую цёплую краіну. І больш Валянцін не бачыў Сынка. Сумуе аб ім да гэтай пары.

Таіса СКУРАТАВА
вёска Камянюкі

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!



— 26 —

Тыдзень пасля Вялікадня зноў было прыгожае надвор'е. Я дамовілася з сябрамі на веласіпедную экскурсію па горадзе. Спачатку на гэтую прапанову адгукнуліся толькі тры асобы (я, Ганка і Матвейка), а пасля далучыліся яшчэ Ігар, Паўл, Кася і Соня. Міколка не хацеў з намі сустракацца, ён пайшоў у царкву. Праўду кажучы, нам ужо абрыд такі Міколка... З-за яго метамарфозы на ўроках зноў было нудотна. Вясною заўсёды няма ахвоты вучыцца, і ўсе мы найлепш уцяклі б на вясёлы прагул.

У суботу мы сустрэліся ў 12 гадзін у цэнтры горада. Першыя дзесяць хвілін мы ездзілі па тратуары, пасля пераехалі ў парк. Там было многа народу, многа моладзі на веласіпедах. Хлопцы ездзілі на скейце, шпацыравалі закаханыя парачкі. Каля будкі з марожаным мы сустрэлі Міколку з яго сімпатыяй — дачкой настаяцеля, Марысяй. Хлапец на прывітанне сказаў нам толькі „чэсць!" (нават да нас не падышоў). Мы ўжо самі хацелі падысці да іх і пазнаёміцца з дзяўчынай Міколкі.

Каля старога дуба мы пабачылі спадарыню Воўк з сямейкай. Быў там і яе ўнучак, якога мы з Ганкай сустрэлі на мерапрыемстве скейтаў. Але ён прыкідваўся быцам нас не ведае і быў горшы за нашага Міколку, бо нават не сказаў нам „чэсць!"

Пасля гадзіннай язды па парку мы паехалі ў бок заапарка. Там нас зачапіла здымачная група рэгіянальнага тэлебачання.

— Чаму вы ездзіце на веласіпедах? — спытаў журналіст.

— Бо ў парк не пускаюць на аўтамашыне! — пажартавала я. Мае сябры пачалі смяяцца, але яны не адважыліся выступіць перад тэлекамерай. Я, вядома, гаварыла і гаварыла! Даказвала як сучасная моладзь абажае спорт і ўсялякія актыўныя формы адпачынку:

— Вось зімой, — гаварыла я, — мы кожную вольную хвіліну прысвячаем катанню на канькách. Вясной адразу перасядаемся на ровары, а летам найахвотней плаваем і ходзім у далёкія вандроўкі.

— А што думаеце пра скейтаў? — спытаў журналіст.

Паколькі ў нашай кампаніі быў заўзяты скейт, мы сілком выпіхнулі Ігара перад тэлекамеру. Але наш сябра быў настолькі ўсхваляваны, што не сказаў ніводнага сэнсоўнага слова.

— А ці спартыўная актыўнасць не мяшае вам у вучобе? — спытаў на канец журналіст.

— Наадварот, — адрэзаў Матвейка, — усе мы выдатнікі.

— Дзякую за інтэрв'ю! — журналіст пажадаў нам вясёлай гульні. — Аглядайце сябе сёння ў 18 гадзін па нашым рэгіянальным тэлебачанні.

— А хто апрача нас яшчэ гаварыў пра веласіпеды і скейтаў? — спытаў Матвейка.

— Пабачыце самі, — заахвоціў нас журналіст...

У 18 гадзін я ўключыла тэлебачанне. Маё выказванне не было бліскучым, мы з Матвейкам гаварылі без складу і ладу, як маленькія дзеткі. Але настрой падняў мне чарговы кадр. Гэтае выказванне рассмяшыла і абурыла мяне! Перад тэлегледачамі выступіла знаёмая парачка — Міколка з Марысяй. Яны даказвалі, што веласіпедысты і скейты самы дзікі народ на свеце.

— Мала таго, што ездзяць як шалёныя і не прыкмячаюць пешаходаў, — гаварыў Міколка, — дык яшчэ спецыяльна наязджаюць на закаханых, каб яны не шпацыравалі па парку трымаючыся за рукі.

І падумаць! Яшчэ два тыдні таму сам Міколка наязджаў на закаханых — гэтакі дзікі жарт нам ніколі не прыйшоў бы ў галаву...

Тэкст: <natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Якое надвор'е?

Маці просіць Рыгора:
— Даражэнькі, правер,
Якое, сынок, надвор'е
Мы маем ужо цяпер?

— Як я магу прыкмеціць,
Адазвайся сынок, —
Дождж і імгла на свеце
І не відаць на крок.

Светлавы год

Сынка тата патрывожыў
Вось пытаннем такім:
— Скажы, што назваць мы можам
Годам светлавым?

— Гэта, даражэнькі тата, —
Адказаў сынок, —
Гадавая аплата
За электрычны ток.

Галерэя „Зоркі" (Беласток)

Оля Мазурук

Оля — дэкламатарка і акторка з беластоцкай „чацвёркі". Ад наймалодшых гадоў дзяўчынка прыгожа і адважна выступае на беларускай сцэне, як усе яе сябры з пятага класа. Пра Олін клас можна сказаць адно — усе пяцікласнікі свабодна размаўляюць на беларускай мове. На дадатак амаль кожны з іх мае крытычны погляд на „Валянцінкі".

Оля таксама не любіць хлопцаў і першая адклікала б Свята закаханых! Абажае затое раслінкі і звяркоў ды ўсялякія паездкі за горад, у свет жывой прыроды.

ЗОРКА

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 12: Як, вол, ар, бярозка, арабінка, граб, мо, бабка, ява, барсук. Глог, яр, баабаб, вярба, мора, бор, лоб, зіма, акно, як, грак, Агата.

Узнагароды, **аўтаручкі-cienkopisy**, выйгралі: **Мартына Сакалоўская, Марыёля Анішчук, Матэвуш Лапінскі, Караліна Шумарская** з Дубін. **Віншуем!**



Беларускі тыдзень у Варшаве

Калі аддаем гэты нумар „Нівы” ў рукі чытачоў, у Варшаве завяршаецца Тыдзень беларускай культуры „Мінск-Мікст”. Жыхары сталіцы маглі ўдзельнічаць у абрадавым і рокавым канцэртах, сустрэцца з пісьменнікамі, паўдзельнічаць у дударскіх майстар-класах, паглядзець дакументальныя фільмы. З Беларусі прыехалі славутасці.

— У назве тыдня „Мікст” гэта скарачэнне ад „мікстура”. Мы хацелі, каб кожны дзень прадставіць іншую галіну беларускага мастацтва, — тлумачыў „Ніве” Дарыюш Жукоўскі, родам з Гарадка, галоўны аўтар ідэі мерапрыемства і заадно шэф варшаўскай галерэі „Зоя”.

Тыдзень арганізавалі Фонд Беларуская ініцыятыва, Галерэя „Зоя”, Міжнародны навуковы гурт Варшаўскага універсітэта „Albaruthenica” і Польскае радыё для замежжа. Суарганізатарам было Пасольства Галандыі. Сямідзённы беларускі марафон пачаў канцэрт, складзены з дзвюх частак пад назвай „Гістарычнае музычнае падарожжа” ў вядомым варшаўскім клубе „Гарэнда”. У першай частцы выступілі тры рок-музыканты: шматразовы Гітарыст года Беларусі Сяржук Трухановіч з „Крамы”, а таксама зорка маладых беларускіх рокменаў, аўтарытэт і легенда, аўтар г.зв. вечнажывых гітоў, заснавальнік гуртоў „Бонда” і „Крама” Ігар Варашкевіч ды Піт Паўлаў, заснавальнік і вакаліст такіх гуртоў як „Н.Р.М.”, „Крыві”, ці „Гарадскія” і „Pette Paff”. У другой частцы прэзентаваліся рокмены малодшага пакалення, гурты „Сьцяна” і „Крок”. Канцэрт быў таксама своеасаблівым дыялогам рокменаў аб сучаснай беларускай музыцы са шматлюдна сабранымі слухачамі. У кулуарах у размове з „Нівай” Піт Паўлаў сказаў:

— У Беларусі рок сапраўды разгарнуўся як з’ява. Пры функцыянаванні несумненных зорак рока не пашыраецца, аднак, такая з’ява як шоу-бізнес. Не працвітае інфраструктура, якая ўплывала б на тое, каб рок мог сам сябе ўтрымліваць. Спалучаецца гэта з фактам, што цэлая група рок-гуртоў мае забарону выступаць на радыё і тэлебачанні. Такім чынам яны не могуць папулярызавацца, у выніку чаго цяжка запоўніць вялікія глядзельныя залы хоць бы на пяць-сем тысяч асоб ці стадыёны. Да таго, каб арганізаваць канцэрт, трэба здабыць шматлікую колькасць дазволаў. Не хопіць зрабіць рэкламу і зняць залу. Гурты, аб якіх гавару, такіх дазволаў не атрымліваюць. Гэта свайго роду маскіраваная форма забароны выступленняў. Здараецца таксама, што нават пасля атрымання дазволаў канцэрт не адбываецца пад відам пажарнай небяспекі ці падтопу або раптам у гэтым месцы будзе арганізавацца нейкі з’езд.

Піт Паўлаў, запытаны намі, што хоча сказаць свету сваёй музыкай, адказаў:

— Я раблю столькі рознага роду музыкі, што мой зварот не такі вузкі і канкрэтны. Я выдаў ужо семнаццаць альбомаў у рознай стылістыцы. Ёсць фолькавыя і востра-рокавыя. Я думаю, што ў гэтым свеце чалавек, з якімі праблемамі змагаецца, як шукае свайго кахання, як барукаецца са сваімі дэпрэсіямі. У нашых тэкстах няма нічога асаблівага. Незадавальненне — звычайны стан рокмузыканта.

Канцэрт Ігара Варашкевіча з Сержуком Трухановічам (злева)

Піт Паўлаў перад канцэртам у „Гарэндзе” ў атачэнні сябровак з Мінска

Сустрэча са студэнтамі Уладзіміра Арлова (справа) і Андрэя Хадановіча

— Ці сапраўды групы, з якімі ты звязаны, іграюць толькі за мяжой?

— „Н.Р.М.” іграе толькі за мяжой, у Беларусі толькі ў малых клубах. Мы мелі такі дзіўны канцэрт у вёсцы, пад адкрытым небам. Шляхам Інтэрнэту далі рэкламу, з’ехалася каля двухсот асоб. І нават у такіх акалічнасцях паявілася міліцыя і спрабавала ўсіх разагнаць. Канцэрт, аднак, адбыўся. Група „Pette Paff” прэзентавала свой апошні дыск у Палацы Рэспублікі. Дазвол, аднак, мусілі мы атрымаць чатырохкратны, паколькі чатыры разы канцэрт адклікаўся. У шоубізнесе гэта самагубства. Людзі ў такой сітуацыі проста ідуць на іншы канцэрт.

Двух вялікіх пісьменікаў Уладзімір Арлоў і Андрэй Хадановіч сустрэліся са студэнтамі беларусістыкі. Першы гэта перш за ўсё празаік, другі — паэт. На жаль, на першую сустрэчу прыйшло толькі пад дваццаць студэнтаў. Абодва літаратары чыталі свае творы, а пасля размаўлялі з маладымі людзьмі. Андрэй Хадановіч прадстаўляў м.інш. сваю паэтычную творчасць — як сам сказаў — на кожную нагоду:

— Адзін з вершаў паслужыў мне для тэрарызму. Выслаў я яго ў мейлевыя скрынкі ўсім знаёмым, — жартаваў.

У сваю чаргу паміж прэзентацыяй сваёй творчасці Уладзімір Арлоў прызнаўся:

— Ува мне шостая частка цыганскай крыві. Гэтая кроў ад маленства гоніць мяне да падарожжаў і пісання.

Прачытаў ён м.інш. вядомы таксама з польскага перакладу твор „Мне прысніўся Хадановіч”. Герой жартам агаварыўся:

— З поўнай адказнасцю запэўніваю, што не адказваю за сны Хадановіча ва Уладзіміра Арлова.

Зараз пасля ўжо цалкам сур’ёзна, хоць метафарычна, Арлоў сказаў:

— Усе, не толькі дзеці, ходзім па зямлі ўпэўнена датуль, калі першы раз паб’ем калені.

Пасля адзначыў:

— Калі я быў студэнтам гісторыі, гісторыя Беларусі была затарможаная Масквой. У той гісторыі не было герояў, адно масы. Гэта кніжкі Караткевіча зрабілі рэвалюцыю ў нашых галовах. Стаў ён для мяне богам і героем. Пасля я адкрыў Быкава.

Кнігі абодвух пісьменнікаў прадстаўляліся таксама ў варшаўскім „Traffic Club”. Тут таксама прэзентаваліся публікацыі з серыі „Беларуская выдавецкая праграма”, перакладзеная ў апошні час творчасць такіх польскіх аўтараў, як Збігнеў Герберт, Чэслаў Мілаш, Яраслаў Івашкевіч і Рафал Ваячак.

У рамках Тыдня „Мінск—Мікст” выступіла ў Варшаве Кася Камоцкая з праграмай на аснове „Народнага альбома”. Два дні ігралі ў Дзяржаўным этнаграфічным музеі дудары з Беларусі і Польшчы, якіх выступам спадрожнічалі майстар-класы. У галерэі „Зоя” можна было паглядзець працы беларускіх мастакоў і дакументальныя фільмы ды аматарскія мультфільмы, пастаўленыя маладымі беларускімі аўтарамі ды набыць кнігі з серыі „Беларуская бібліятэка”, якую выдае Калегія Усходняй Еўропы з Вроцлава, перакладзеныя на польскую мову — „Gdy witają się dusze” Рыгора Барадуліна і Васіля Быкава, „Szczęśliwego Nowego Rocku” Андрэя Хадановіча і „Kochanek jej wysokości” Уладзіміра Арлова (рэцэнзіі на гэтыя кнігі публікаваліся ў „Ніве”).

Тэкст і фота Раіны СТЭФАНЧУК

Ссыльная Алена Стасевіч (2)

Алена Стасевічанка нар. 12 лютага1925 г. у Астраўчыцах пад Ваўкавыскам. Ад 1956 г. разам з мужам Валянцінам Галэмбёўскім у Беластоку. Працавала на будовах, пасля лабаранткай. Памерла пасля цяжкай хваробы 6 кастрычніка 2006 г., пры добрай памяці. Аб пражытым расказала пару дзён да пакутнай канчыны. Памятку пра сваё жыццё пакінула таксама ў вершах.

У той галодны час у Казахстане мая матуля зусім аслабла, не давала рады падняцца з пасцелі. І так уздыхнула: „Ах, як хочацца перад смерцю спрабаваць хлеба!" Бо нічога галоднаму не хочацца так, як хлеба. У гэтым калгасе была пякарня, вялі яе грэкі — сужонства. Я пайшла да іх папрасіцца кавалачка хлеба. Кажу, што мая мама пры смерці, і так ёй хочацца пакаштаваць хлеба. Грачанка кажа: нам нельга нічога даваць, бо ўсё калгаснае. А грэк паглядзеў па бохнах, можа які палопаны, і ад шасці ўламаў па кавалку, такім, што на два кусы ў рот. Далі мне яшчэ адно яйка. Я была ў фартушку, паклала туды кавалкі хлеба і нясу, а на паўдарогі бачу, бягуць мае браты — ведалі, куды я пайшла. Дала я ім па два кавалачкі, а два большыя панесла маме. Зварыла яйка і даю маме, ды матуля абдзяліла нас ім па адной лыжачцы — бо як жа ж ёй есці яго адной. Праз нейкі час прыйшла да нас пасылка ад далёкіх сваякоў, якім я раней напісала, скардзячыся, што не маем тут што есці.

Маглі мы хадзіць па ваколіцы дыяметрам 2 кіламетраў. 4 кіламетры ад нас было мястэчка, у якім можна было штосьці прадаць і купіць хлеб ці што іншае, калі была магчымасць. Працавалі мы пры бавоўне. За работу нам не плацілі. А хто на працу не хацеў ісці, дык давалі дыхту. Зусім з намі не лічыліся. І дзень у дзень мы хадзілі на работу. Цяпер думаю: як мы гэта ўсё стрымалі? Хадзілі мы худыя як шкілеты. Калі б не дапамога, мабыць, не перажылі б. У гэтым месцы, дзе нас пасялілі, былі людзі з усяго свету, 33 нацыянальнасцей. Дагаварыцца можна было па-руску, хоць некаторыя мала разумелі, а былі і такія, з кім немагчыма была паразумецца. У першы дзень на рабоце я пазнаёмілася з хлопцам, палякам, Валікам Галэмбёўскім. Мой будучы муж паходзіў таксама з Ваўкавыскага павета. Быў асуджаны на 8 гадоў турмы ды на вечную ссылку пасля зняволення. Тое, што я перажыла, не раўнялася з ягоным. Гэта праўда, што мужчын яшчэ больш мучылі, ламалі ім косці, выбівалі зубы... Працавалі мы з Валікам разам, і рашылі быць разам. Напісалі мы ліст парафіяльнаму дэкану ў Беларусь, што хочам пабрацца шлюбам, і што тут няма касцёлаў і ксяндзоў — што ж нам рабіць? Ксёндз параіў, каб жылі мы разам, калі наша такая воля. А калі Бог дасць, вернемся на радзіму і павянчаемся. Так мы і зрабілі. Праз нейкі час нарадзіўся нам сынок, сямімесячны. Быў такі малюсенькі і худзенькі, што здавалася, жыць не будзе. Малака ў грудзях я не мела. Божа, што ж рабіць? Удалося нам купіць малака. Гадавалі мы як маглі сыночка ў такіх страшных умовах, увесь час у страху, што нам памрэ. Мы мелі з сабою свянцоную ваду. Мама кажа: давайце назавем яго Рышард, каб, калі выжыве, рускія не казалі на яго „Іван" (я ж хацела назваць сынка Янушак). Ахрысцілі Рышардам. Малы ледзь дыхае, а і мне вельмі блага, ды праз 10 дзён прыйшлі і пагналі мяне на работу. А я ж падняцца не магу. Не даравалі, тры разы прыходзілі па мяне, бо кожны перасяленец мусіць працаваць. Узяла я малога са слязамі ў вачах, крыху пялюшак, бутэльку з малаком, прасціну і пайшла. На полі памаглі мне жанчыны загарнуць Рысіка ў прасціну і ўвязаць, каб не выпаў мне з гэтай насілкі. Памагалі мне кабеты справіцца з нормай, бо баялася я, што дзіця задушыцца за маёй спіной. Была такая спякота, што я малако закопвала ў пясок, каб не скісла. Мой муж не заўсёды працаваў са мною разам, пасылалі яго да іншых работ. І таму мне было яшчэ цяжэй.

Рысік вельмі цяжка хварэў, быў страшна кволы — я баялася аддаць яго ў яслі, каб там не памёр ад голаду і недагляду. І таму ўвесь час насіла я яго на спіне ў прасціне. Малеча хварэў вельмі моцна. Лекар быў 20 кіламетраў ад месца нашага пражывання. Лячылі мы малога хатнімі спосабамі — зеллем сабраным у стэпе і сабачым салам. Рысік увесь час плакаў, начамі не спаў ад голаду і хвароб, а калі падрос, быў страшна імпульсіўны, нервовы і неўраўнаважаны. Часта кідаўся ў злосць — усіх кусаў, біў, штурхаў. Нішчыў усё, што яму пад руку трапіла. Вельмі цяжка было яго супакоіць. На від кагосьці ў форме ці казаха-брыгадзіра з нагайкай у руцэ калаціўся ад страху, уцякаў і кідаўся ў спазмы. Вельмі баяўся гучных размоў, крыкаў, увогуле чужых людзей.

У 1956 годзе, пасля чатырох з паловай года нашага прабывання ў ссылцы, у верасні мы прыехалі ў Польшчу. Рысіку было тады два гады — быў лёгкі, бы пёрка, адна скура ды косці. Суседзі, убачыўшы нашага сынка, плакалі і не верылі, што будзе ён жыць і даваліся цуду, што ўсё ж жыве. Дзякуючы Божай дапамозе і падтрымцы суседзяў, што вазілі яго па знаёмых лекарах — выжыў. Цяпер мой Рышард дарослы мужчына, бацька пары хлопцаў, ды што зробіш — увесь час хварэе.

Склала я малітву, яшчэ ў лагеры, якую мы гаварылі па захадзе сонца, гледзячы ў бок нашай радзімы:

„Божа-Ойча, мы, Твае дзеці, плачам, рыдаем, жабруем лепшай долі, год за годам марна пралятае, а мы ў няволі, мы — у няволі. Твае словы нас навучылі, што палічаны кожны волас. Божа, палічы нашы магілы, жонак, маці, што плачуць, голас. Пралілі крыві мы многа, так што бацькоў адмылі грэх, ды не стане на суцеху слёз да Бога. Божа, падаем мы на калені, нахіляемся ў пакоры. За Айчыну мы ў маленні, што ў крыві ды слязах моры. Уваскрасі яе, наш Божа, Госпадзе, што ў небе Панам. Справядлівай даланёю толькі Бог ёй дапаможа! Дай нам дах і дом свой, Божа! Паламі той меч паганы, што сек край наш нам забраны. Дай вярнуцца на радзіму тым, што туляюцца па свеце, што іх носіць чужы вецер. Чуеш беспрытульных спевы — з-над Нёмна, Варты, Буга кроў пакутнікаў заве. Паламі той меч паганы, што сек край наш нам забраны. Дай вярнуцца на радзіму вольнымі людзьмі".

— Не было лепшага чалавека, як мая свякруха Алена, — успамінае жонка Рышарда Галэмбёўскага, Анна. — Незалежна ад гэтых пакут, якія перажыла ў сваім нялёгкім жыцці, перапаўняла яе радасць жыцця, дабрыня, спрыянне людзям. Усёдаравальная ўсмешка на твары. На нашых сыноў, сваіх каханых унучачкаў, не давала гучнейшага слова сказаць. Свету за імі не бачыла. Мелі яны мець спакойнае, бяспечнае, шчаслівае дзяцінства. Ніколі не наракала, што ёй штосьці баліць. Захварэла лейкеміяй. Дала рады хваробе. Ды прыхапіла яе эксудатыўнае запаленне лёгкіх. Не памаглі лекі. Пры памяці добрай быўшы, распарадзілася наконт свайго пахавання, іншых спраў, паўспамінала былое. Лекары сцвердзілі: „цалкавітае ракавае вынішчэнне арганізма". Яе спакутаванае цела месціла ў сабе такі моцны дух!

Міра ЛУКША

Конкурс „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга"

Згуртаванне „Uroczysko", Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі ў Беластоку і Цэнтр грамадзянскіх ініцыятыў „Трэці сектар" у Гродне аб'явілі адкрыты літаратурны конкурс. Яго мэтай з'яўлялася сабранне непублікаваных літаратурных твораў (эсэ, апавяданне, верш), апісваючых легенды, міфы і звычаі з тэрыторыі Падляшша і Гродзеншчыны. Завяршэнне конкурсу адбылося 29 сакавіка 2007 г. Узнагароды будуць уручаны на літаратурным вечары ў час Сустрэч з натурай і мастацтвам „Uroczysko" ў чэрвені.

Капітул конкурсу — Кшыштаф Вольфрам — старшыня Згуртавання „Uroczysko", Яніна Чыжэўская — гісторык і аніматар культуры, Вітаўт Руднік — старшыня Цэнтра грамадзянскіх ініцыятыў „Трэці Сектар" з Гродна, Лана Руднік — каардынатар адукацыйных праграм Цэнтра „Трэці Сектар", Міра Лукша — пісьменніца, журналістка „Нівы", Марэк Тышкевіч — акцёр, рэжысёр, выкладчык Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі ў Беластоку, Марта Шымская — сацыёлаг, аніматар культуры, камісар Сустрэч з натурай і мастацтвам „Uroczysko" — пазнаёміўся з матэрыяламі, прысланымі на конкурс — 43 працамі з Польшчы, 1 з Берліна і 9 з Беларусі і рашыў прызначыць наступныя ўзнагароды:

Гран-пры конкурсу атрымаў Тамаш Ліпаман з Белавежы за сабранне і ўвекавечанне найцікавейшых легенд з тэрыторыі Кнышынскай пушчы і рэшты Падляшша (13 легенд). На падставе выбраных легенд яго аўтарства будзе падрыхтаваны пленэрны тэатральны спектакль у Кнышынскай пушчы. Раўнапраўнымі ўзнагародамі вылучаны: Рафал Сянко за легенду „Златорыя", Тамаш Здрайкоўскі за апавяданне „Бераг", Сільвія Русіняк за апавесць „Пра чалавека, які не пайшоў у неба, а і ў пекле месца яму не хапіла", Кастусь Казлоўскі з Гарадка за легенду „Дзе воды Плоскай рвуць берагі", Юліта Сакоўская за „Гісторыю Гаўрыіла", Тамаш Пётр Краўчук за апавяданне „Татку, чапаная...", Ала Петрушкевіч за легенды „Антанёва — легенды і былі лясной вёскі", Сяргей Чыгрын за „Слонімскія паданні і легенды", Таццяна Трахімчык за верш „Легенда аб Слоніме". Спецыяльнае вылучэнне атрымаў Генрык Цыпрыян Конкаль з Берліна за фантастычнае падарожжа да сваіх каранёў на Падляшша і на „Крэсы" — за тэкст „Над Прэголяй і Нёманам".

Узнагароджаныя капітулам конкурсу працы будуць прадстаўлены ў час XII „Uroczyska" ў Супраслі (аўтарам з-па-за Беластока гарантуецца начлег і харчаванне), 6 або 9 чэрвеня г.г., а пасля апублікаваныя ў кнізе „Міфы і легенды ад Нёмана да Буга" (польска-беларускае выданне) восенню 2007 г. Да публікацыі ў кнізе кваліфікаваны, апрача ўзганароджаных, яшчэ наступныя працы: легенда аб пасяленнях у Кнышынскай пушчы Анны Шпакоўскай, „Дзядоўская балада" аб каралі Зыгмунце Аўгусце Тадэвуша Бурачэўскага, эсэ аб Падляшшы Караліны Шарлат, эсэ аб крыжах „Каравіка" Казіміра Гнатоўскага, легенда аб Дзівание Яцка Данілевіча, легенда аб справядлівым хлебе Барбары Пашкоўскай, „Ганьчак" Тадэвуша Хармушкі, „Гаданне Трапятухі" Рэгіны Свiтонь, вясельныя песні і віншаванні сабраныя Крыстынай Гудэль, а таксама працы з Беларусі — „Сіцыліянская абарона" Генадзя Прудзілкі, легенда аб Крэве Уладзіміра Прыхача, легенда ад Лідзе Станіслава Беркуса і легенда аб Поразаве Веранікі Багалейшы. **(лук)**



www.salidarnasc.org

Палітычныя рэпрэсіі, якія апошнім часам узнавіліся ў Беларусі, не абышлі сваім адлюстраваннем і сайты Байнэта. Калі на інфармацыйных парталах збольшага распавядаюць аб тым, што і дзе адбылося, то ёсць і сайты, дзе пакрыўджаныя праз уладу людзі могуць знайсці сабе нейкую падтрымку. Адным з такіх парталаў ёсць „Салідарнасць", які месціцца па адрасе www.salidarnasc.org.

Колерам усяго сайта ёсць блакітны, з чаго трэба разумець, што ягоныя распрацоўшчыкі ўзялі на ўзбраенне джынсавы колер мінулагодніх выступленняў моладзі. Гэта нядзіўна, бо пачатак працы сайта абумоўлены менавіта падзеямі канца сакавіка мінулага года, якія адбыліся на Плошчы Каліноўскага і рэпрэсіямі над удзельнікамі палатачнага лагера.

Першая старонка сайта падзелена на традыцыйныя тры часткі. Уверсе каля назвы „Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць»" месцяцца словы Яна Паўла II „Не бойцеся!" З правага боку размешчана эмблема Камітэта. Усё гэта знаходзіцца на фоне выяўлення ўзляцеўшых у неба белых галубоў.

Размяшчэнне навінных паведамленняў простае, але з густам. Пасярэдзіне першай старонкі галоўная навіна з фотаздымкам. Правая частка аддадзена пад анонсы навін, якія папярэднічалі галоўнай. Яшчэ далей месціцца выйсце да спісу тых, хто быў затрыманы на сёлетнім Дні Волі ў цэлай Беларусі.

Выйсці да іншых рубрык сайта знаходзяцца з левага боку і пад яго назвай. Найбольш цікавымі з іх падаюцца старонкі „Пра нас" і „Наша праца". „Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» быў скліканы 5 красавіка, адразу ж пасьля вясновых падзеяў 2006 года, — распавядаюць аб сабе актывісты арганізацыі. — У сакавіку беларусы даказалі, што яны хочуць бачыць Беларусь дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавай і гатовыя дзеля гэтага ахвяраваць асабістым дабрабытам, свабодай, нават жыццём. Рэжым зрэагаваў на мірны пратэст людзей супраць фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў хваляй рэпрэсіяў. Столькі рэпрэсаваных за адзін тыдзень — больш за 1 000 чалавек — нашая краіна ў сваёй сучаснай гісторыі яшчэ ня бачыла! У Менску былі перапоўненыя турмы, моладзь выключалі з універсытэтаў, актывістаў пазбаўлялі працы. Таму вядомыя праваабаронцы, грамадзкія дзеячы і проста неабыякавыя людзі з тых, хто арганізоўваў дыжуры пад сьценамі Акрэсьціна і Жодзіна, сабраліся на нараду й вырашылі працаваць разам, каб абараніць ад наступу рэжыму сяброў дэмакратычнага руху".

Справа Камітэта сапраўды вартая павагі, бо дзякуючы яму многія людзі, асабліва моладзь, змаглі знайсці выйсце з таго становішча, у якое часцяком ставіць сумленных людзей жыццё. Праўда, сям'я не без выradка. У кола гэтых людзей бывае трапляюць тыя, хто папросту хоча сабе нешта прыдбаць, прыкрываючыся словамі і выглядам сапраўдных змагароў з дыктатурай. Для таго, каб неяк адсекчы гэтых „апазіцыянераў", Камітэт распавядае пра тыя пацвярджэнні, якія абавязаны мець рэпрэсаваныя, калі яны звяртаюцца да яго па дапамогу. Спіс гэтых дакументаў змешчаны ў рубрыцы „Неабходныя дакументы".

Таксама цікавай падаецца рубрыка „Чорны спіс", дзе месцяцца назвы тых навучальных устаноў Беларусі, дзе па палітычных матывах былі выключаны або атрымалі нейкі ўціск студэнты. Час мінае хутка, і хто ведае, можа калісьці адміністратары нешматлікіх ВНУ будуць распавядаць пра сваю спрадвечную павагу да студэнцкага вальнадумства, матывуючы яе няўключанасцю ў гэты спіс.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Адзнакі ў залікоўку

Чэмпіянат Еўропы па дзюдо, што прайшоў у сербскай сталіцы, стаў першым турнірам, на якім пачалі разыгрывацца ліцэнзіі на ўдзел у пекінскай алімпіядзе. Усяго такіх адборавых спаборніцтваў будзе чатырнаццаць. Па іх выніках налічваюцца заліковыя балы, прычым пад увагу будуць брацца чатыры лепшыя выступы канкрэтнага дзюдаіста ці дзюдаісткі. Сістэма досыць складаная, але, падобна на тое, найбольш аб'ектыўная. Не дзіва, што ў Бялград прыехалі амаль усе мацнейшыя еўрапейскія майстры татамі — кожнаму хочацца як хутчэй запісаць на свой рахунак запаветныя балы. Геаграфія прадстаўніцтва ў кантынентальным дзюдо цяпер досыць шырокая. Дастаткова сказаць, што ў мужчын у сямі вагавых катэгорыях (у кожнай змагаліся ў сярэднім па 30 чалавек) медалі здабылі спартоўцы ажно 16 краін. Удакладнім, што ў дзюдо даюцца два бронзавыя медалі — за трэцяе месца змагаюцца па дзве пары прэтэндэнтаў. Найбольш у агульным заліку вызначыліся грузінскія барцы — у іх скарбонцы 5 медалёў, Расія займела 4 узнагароды, Францыя — 3, Беларусь, Польшча і Ізраіль — па 2.

Сярод айчынных удзельнікаў прызёрамі сталі Канстанцін Сямёнаў (катэгорыя да 73 кг) — ён адзначаны бронзай і Сяргей Шундзікаў (да 81 кг), які стаў на еўрачэмпіянаце другім. У фінале леташні чэмпіён Шундзікаў змагаўся з трохразовым бронзавым прызёрам пяршынстваў Старога свету Робертам Краўчыкам — у выніку золата прыпала польскаму прадстаўніку. Што датычыць Сямёнава, то ён выявіў не проста майстэрства, а яшчэ і якасці, уласцівыя героям баевіку. Беларускія заўзятары маглі пераканацца ў гэтым увачавідкі, паколькі чэмпіянат шырока асвятляўся на даступным тэлеканале Eurosport. У паядынку за трэцяе месца сапернікам нашага атлета быў партугальскі дзюдаіст. Беларус выканаў тры выніковыя кідкі і, здавалася, упэўнена перамагаў. Як раптам, партугалец здзейсніў прыём, пасля якога Канстанцін моцна пашкодзіў плячо. Апошнія секунды сустрэчы былі звыш драматычнымі — апанент пайшоў ва-банк, але Сямёнаў здолеў блакаваць захоп і эфектна прызямліў партугальца на спіну, заслужыўшы ад арбітраў ацэнку „іпон" — чыстая перамога.

Прыемна, што адразу два нашы дзюдаісты атрымалі такія высокія адзнакі ў сваю „залікоўку". З іншых беларусаў варта адзначыць досыць вядомага Андрэя Казусёнка, які стаў пятым у катэгорыі да 90 кг. Дадам таксама, што наш алімпійскі чэмпіён Ігар Макараў не выступаў на чэмпіянаце.

У жанчын не было роўных француженкам — у іх актыве ажно 6 медалёў (з іх 4 — залатыя!). Па тры поспехі ў славенак і іспанак, па два ў прадстаўніц „слабога" полу з Нідэрландаў і Нямеччыны. Усяго ў прызёрках апынуліся 16 краін. На жаль, ніхто з пяці заяўленых беларусак да п'едэстала не дацягнуў. Лепшай з іх стала малавядомая Святлана Цімашэнка — 5-е месца ў катэгорыі да 78 кг. А досыць тытулаваная Юлія Барысік у найбольш цяжкай вазе заняла 9-е месца. Але напярадзе яшчэ многа этапаў Кубка свету, Суперкубак і ўрэшце чэмпіянат планеты — адборавая пара да галоўнага алімпійскага старту будзе доўгай.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гайнаўскі беларускі ліцэй

Гэта загаловак новай кнігі, якая нядаўна выйшла з друку. Аўтарамі яе з'яўляюцца А. Іванюк і В. Сакоўскі.

На 133 старонках гэтай кнігі змешчана пяцьдзесят пяць гадоў існавання Гайнаўскага беларускага ліцэя. Ад яго паўстання ў верасні 1949 года да чэрвеня 2004 года.

На працягу гэтага часу ліцэй меў 51 выпуск і закончыла яго 3 234 выпускнікі. А вучылася ў ім значна большая колькасць моладзі. Калісьці была яшчэ „малая матура" (9 класаў) і пасля яе адыходзіла са школы нямала вучняў адразу на працу (пераважна інтэлігенцкай), далей прадаўжаючы сваю адукацыю ўжо ў вячэрніх ці завочных школах. Так што вучылася ў ліцэі вялікая колькасць нашай мясцовай моладзі.

Нялёгкія гэта былі гады для школьніцтва ўвогуле, яшчэ цяжэйшыя для беларускага нацыянальнага школьніцтва і гайнаўскага белліцэя ў прыватнасці.

За гэты час школа аж чатыры разы змяняла сваю назву. Моцна змяніўся школьны будынак і тое што ёсць і робіцца ў ім. Змянілася нават назва вуліцы пры якой стаіць.

Спачатку быў гэта старэнькі, цесны, халодны будынак барачнага тыпу. У ім не было ні гімнастычнай залы, ні туалетаў на месцы, ні нават праточнай вады. Такой жа ўбогенькай была і матэрыяльная база гэтай школкі. І назва вуліцы, пры якой стаяла, называлася — Вызвалення. А цяпер — вялікае, прыгожае збудаванне з вялікай, прыгожай гімнастычнай залай, багатай бібліятэкай, сталовай, душамі ды іншымі прычындаламі. Гэта ўжо, смела можна сказаць, сярэдняя навучальная ўстанова дваццаць першага стагоддзя. Ды і стаіць яна не пры вуліцы Вызвалення, а пры Пілсудскага. Бо і чаго ж можна навучыць пры Вызвалення — ні матэматыкі, ні, тым больш, патрыятызму. А вось пры Пілсудскага — наадварот. Гучыць громка, патрыятычна і часта.

Змяняліся дырэктары школы, па-мойму, зачаста. За маю трыццаціпяцігадовую працу ў ліцэі меў я над сабой пяць дырэктараў. І на нікога з іх не наракаю. Усе яны былі адданыя школе, падрыхтаваныя, чалавечыя, у асноўным партыйныя, але мяне, беспартыйца, не крыўдзілі, хаця намагаліся і мяне зрабіць членам партыі. Я не захацеў — і на тым скончылася. І так з кожным было. Калі ж хто стаў членам партыі, цяпер не павінен шукаць вінаватых. А так, на жаль, бывае, што былыя актыўныя партыйцы, раптам парабіліся ярымі антыпартыйцамі і нават шукаюць вінаватых за сваю партыйнасць. Таксама вядуць сябе і многія ўбоўскія супрацоўнікі. Дзярмо яны, бо калі належаў ці супрацоўнічаў, то хаця памаўчы цяпер. Не лепшыя і сучасныя функцыянеры.

Змяняліся ў школе настаўнікі: адны адыходзілі да іншай працы, другія — на пенсію. На іх месца прыходзілі новыя. Прайшло нас праз школу многа і кожны з нас нейкі след у школе аставіў. Наш настаўніцкі калектыў быў заўсёды дружны, сімпатычны, вясёлы, добра падрыхтаваны. Характэрнай рысай нашага педсавета было тое, што ў яго складзе заўсёды было даволі многа мужчын. Усіх нашых настаўнікаў успамінаю з вялікай сімпатыяй. На жаль, многія з іх адышлі ўжо ў іншы, лепшы свет. Я вельмі рады, што менавіта гэтай і такой школе аддаў усё сваё працоўнае жыццё...

Некалькі добрых, цёплых слоў трэба прысвяціць таксама нашым былым ліцэістам і іх бацькам.

У нашым ліцэі вучылася як гарадская моладзь, так і моладзь з нашых акалічных пушчанскіх і прыпушчанскіх вёсак. Адным словам — глыбокая правінцыя. Абсалютную большасць вучнёўскай моладзі заўсёды складалі беларусы, праваслаўныя. Але нямала заўсёды вучылася таксама польскай каталіцкай моладзі, баптыстаў, іегавістаў і бадай усіх іншых веравызнанняў у нашай мясцовасці.

І ўсё ж такі, нягледзячы на такую нацыянальна-рэлігійна-сацыяльную мешаніну, ліцэю ўдавалася стварыць з іх працоўныя калектывы і дружную школьную сям'ю. Я проста не прыпамінаю, каб з гэтых повадаў узнікалі між імі нейкія непаразуменні ці канфлікты. Гэта была добрая, працавітая, дысцыплінаваная моладзь. І добрыя, дысцыплінаваныя іх бацькі з яшчэ дзедаўскімі выхаваўча-педагагічнымі метадамі. Яны ўмелі пакорна выслухаць нас, настаўнікаў, насяк-нутых ужо новымі выхаваўча-педагагічнымі метадамі і назойліва прапаведаваўшых іх — і згадзіцца з імі. Але, канешне, больш верылі ў сваю педагогіку. Яны не баяліся сваіх дзяцей, як многія цяперашнія бацькі, і на розныя адмоўныя праявы сваіх дзяцей рэагавалі адразу. З імі добра складалася нашае супрацоўніцтва.

Вось аб усім гэтым і многім іншым пішацца на старонках згаданай кніжкі. Па імю і прозвішчу названы таксама ўсе выпускнікі нашага ліцэя.

Васіль САКОЎСКІ

Арлянскія праблемы

28 лютага, на чацвёртае пасяджэнне Рады Арлянскай гміны нечакана з'явіўся павятовы камендант паліцыі ў Бельску-Падляшскім Ян Апалінскі. На пачатку гаварыў ён пра бяспеку ў гміне, каб на канец звярнуцца да радных з просьбай.

Сказаў ён, што на дарогах павета ўсё прыбывае транспартных сродкаў: на працягу аднаго года каля дзвюх тысяч. (Ад сябе дадам: за апошнія чатыры гады пабольшала іх на 5 118 штук, г.зн. на 15%). Калі ездзіць больш чым 33 тысячы транспартных сродкаў, гэта абазначае, што карыстаецца імі кожны другі жыхар павета.

На тэрыторыі Арлянскай гміны зафіксавана ў мінулым годзе 76 правапарушэнняў (гэта нямнога на фоне павета, дзе іх было пад 15 тысяч). Арлянская гміна бяспечная, але праблемы ёсць, асабліва са злоўжываннем алкаголем, а за гэтым і з насіллем у сям'і: шмат было інтэрвенцый — аж 37. Гэта вялікі клопат маладому мясцоваму ўчастковаму Славаміру Нічыпаруку. Ён павінен ведаць, што дзеецца ў гміне і дапамагаць людзям пераадольваць праблемы. І менавіта дзеля гэтага камендант звярнуўся да Рады з просьбай выдзеліць 15 тысяч злотаў на куплю паліцэйскай машыны. Такая сярэднестандартная заходняя машына каштуе каля 50 тысяч злотаў. Бельскі староста абяцае выдзеліць на яе 10 тысяч, а 25 тысяч галоўны камендант паліцыі з цэнтральных фондаў. Камендант Апалінскі падкрэсліў, што пасля куплі гэтай машынай маглі б карыстацца гмінныя службы — Асяродак сацыяльнай дапамогі і Камісія па справах алкагольных праблемаў.

Мяркую, што войт да гэтай просьбы паставіцца прыхільна ды падтрымае яе большасць радных. Я, як радны, лічу, што бюджэт Арлянскай гміны і так не задавальняе яе патрэб і на гэтую мэту грошай не павінен выдзяляць. А чаму? Бо ўжо раней гміна купіла арлянскай паліцыі новы „Паланез" — ён ездзіць па сённяшні дзень. А абсталяванне паліцыі з'яўляецца задачай урада, а не самакіравання, якое ў асноўным сілкуецца датацыямі і скромнымі падаткавымі паступленнямі ды дзе і так на ўсё не хапае грошай.

* * *

Пра алкагольныя праблемы ў Арлянскай гміне пытаю Іаланту Зофію Леўчук з Камісіі па справах алкагольных праблемаў.

Паводле інфармацыі Непублічнай амбулаторыі ў Орлі, каля 10% насельніцтва, у пераважнай большасці мужчын, пакутуе ад сур'ёзных захворванняў у выніку працяглага і празмернага спажывання алкагольных напояў. Гэта хваробы крывяноснай сістэмы, страваводa, асабліва печані, страўніка і падстраўнікавай залозы ды хваробы нервовай сістэмы, напр. алкагольная эпілепсія, а таксама хваробы скуры ды пухліны.

Хварэюць не толькі тыя што п'юць, але і члены іх сем'яў. Сужэнцы алкаголікаў пакутуюць ад неўрозаў або дэпрэсій. Дзеці з такіх сем'яў часта запалоханыя, неўратычныя, з нізкай самаацэнкай або наадварот: у школе і дома праяўляюць бунтаўнічыя і агрэсіўныя адносіны. Часцей ад сваіх равеснікаў з г.зв. „добрых" сем'яў прычыняюць выхаваўчыя клопаты, сягаюць па папяросы і алкаголь. У сем'ях з алкагольнымі праблемамі часта здараюцца авантуры і акты насілля ў адносінах да сямейнікаў. Маючы на ўвазе гэта і скромныя фінансавыя сродкі (30 тысяч у год з канцэсій на продаж алкаголю — М. М.), якімі распараджаецца гміна, штогод ствараем праграму дапамогі найслабейшым у такіх сем'ях, асабліва дзецям.

У мінулым годзе паступіла 13 пісьмовых заявак у справе скіравання на прымусовае лячэнне злоўжываючых алкаголем і насілля асоб; 5 заявак паступіла ад сем'яў, 2 ад паліцыі і 5 ад пракуратуры.

Гмінная камісія 13 разоў выступала ва ўчастках з заяўкамі аб выведцы на месцы пра злоўжывальнікаў і іх сем'і. Пасля пацвярджэння праводзілі прафілактычна-асцерагальныя гутаркі; клікалі 12 асоб. У выніку камісія накіравала 8 заявак у суд наконт судовай пастановы пра абавязковы курс лячэння ад алкагалізму. Сем асоб суд абавязаў да такога лячэння, а адну справу спыніў па прычыне смерці адказчыка.

Апрача гэтага камісія спыніла справы ў адносінах да трох асоб: адна з іх трапіла ў турму, другая згадзілася лячыцца, а трэцяя перастала піць алкаголь, — падкрэсліла спадарыня Леўчук.

На маё хадайніцтва камісія ўпершыню запісала ў праграму для рэалізацыі стварэнне на тэрыторыі гміны сацыятэрапеўтычнай святліцы або ўстановы дзённай падтрымкі дзяцей і моладзі ды дафінансаванне яе дзейнасці.

Міхал МІНЦЭВІЧ

МЕЛЬНІЦКАЯ АПАЗІЦЫЯ НЕ ЗДАЕЦЦА

Нядаўнія самаўрадавыя выбары выявілі ў кожнай гміне кола незадаволеных асобай войта ці бурмістра людзей. І хаця прычыны незадаволенасці наогул абгрунтаваныя, аднак дэмакратычная большасць галасуе за захаванне статус-кво. А незадаволеныя радныя або маўчаць, або гуртуюцца ў апазіцыйную групоўку, якая не толькі што не мае ніякага ўплыву на ход лакальных спраў, то яшчэ выбаршчыкамі ўспрымаюцца як „падкупленыя" войтам здраднікі сваіх выбарчых абяцанняў.

Аднак можа быць іначай. Група радных у Мельніку, незадаволеных дзейнасцю войта Яўгена Вікоўскага, вырашыла ў далейшым змагацца за сваё і прынамсі не страціць даверу выбаршчыкаў. Знайшлі яны выдатны спосаб, каб дайсці са сваімі меркаваннямі да мясцовага грамадства. За частку сваіх камандзіровачных сталі выдаваць бюлетэнь „Супольнасць Мельніцкай гміны", які бясплатна распаўсюджваюць пісьманосцы на тэрыторыі гміны. У газетцы прэзентуюць яны свой пункт гледжання, паказваюць спосаб галасавання на сесіях, прыводзяць выказванні, нават бязглуздыя, сваіх праціўнікаў. Проста, паказваюць хто і як працуе ў Радзе гміны за дзяржаўныя грошы. „Хаця мы, радныя, з'яўляемся бездапаможнымі, — пракаментаваў становішча апазіцыі Казімеж Табота, — аднак хочам выказваць свае меркаванні. Каб не атрымалася так, што мы, прадстаўнікі грамадства, выбраныя гэтым грамадствам нічога не рабілі, што не было нашай думкі".

Першай справай, у ходзе якой сутыкнуліся аргументы грамадства з аргументамі трымаючых уладу, было пытанне лакалізацыі ачышчальні сцёкаў. Войт настойваў, каб размясціць яе ў маляўнічым закутку пры ўездзе ў Мельнік, акурат у месцы, у якім геолагі знайшлі крыніцы гарачай вады. Апазіцыя яшчэ раней, у папярэдніх скліканнях, прапанавала іншыя лакалізацыі, каб не знішчыць ландшафтных каштоўнасцей гміны, якія так ахвотна наведваюць турысты і рыбаловы. Падчас нядаўняй сесіі яшчэ раз праводзіўся агляд месца лакалізацыі ачышчальні. І стаўся цуд — амаль усе радныя, за выключэннем двух, прагаласавалі за перанясенне інвестыцыі ў іншае месца. Апазіцыйныя радныя, якія не вераць у цуды, упэўненыя, што асвятленне гэтага канфлікту на старонках гмінnай газеткі паўплывала на змену крытыкаванай лакалізацыі. Цуд гэта, ці не цуд, але напэўна першая перамога здаровага сэнсу. Каб толькі былі чарговыя!

Марк ЦЫБАРТ

Малады святар

Пётр Касінскі нарадзіўся 29 сакавіка 1975 года ў Саколцы. Ужо з малых гадоў наведваў разам з бацькамі царкву Аляксандра Неўскага ў родным горадзе. У 1990 годзе, пасля заканчэння пачатковай школы, прадаўжае навуку ў агульнаадукацыйным ліцэі і духоўнай семінарыі ў Варшаве. 4 снежня 1992г. мітрапаліт Васілій узводзіць яго ў чын псаломшчыка. Гэтая падзея мацуе яго ў праваслаўнай веры і становіцца стымулам для далейшай духоўнай адукацыі, дзеля якой уступае ў варшаўскую Вышэйшую духоўную семінарыю. У 1995 годзе выязджае ў Румынію, дзе на працягу года ў Сучаве вывучае румынскую мову і далей штудзіруе пастырскую тэалогію ў Праваслаўным універсітэце ў Бухарэсце.

У румын рымскі радавод. Яны працяглы час жылі поруч славян, туркаў і іншых нацый. Стагоддзямі змагаліся яны супраць прыгнятальнікаў і ў 1878 годзе дабіліся свабоды. Спярша ў склад румынскай дзяржавы ўвайшлі наддунайская Валахія і частка Малдавіі, а пасля першай сусветнай вайны і Трансільванія — гістарычная краіна, якая раскінулася на трохвугольным плато паміж Паўднёвымі і Усходнімі Карпатамі. Пейзажнае багацце Румыніі ўзбагачаюць маляўніча сітуаваныя манастары і цэрквы.

а. Пётр Касінскі

15 кастрычніка 2000 года ў Беластоку епіскап Іакаў здзяйсняе абрад рукапалажэння Пятра Касінскага ў сан дыяканa. З таго ж дня новы святар назначаны дыяканам Прачысценскага прыхода ў Ольштыне. У снежні таго ж года Пётр Касінскі вянчаецца з Кацярынай — прыгожай дачкой свайго настаяцеля а. Аляксандра Шаломава. Пётр Касінскі нёс таксама духоўную паслугу ў Праабражэнскім прыходзе ў Мрангове і Свята-Юр'еўскім у Ожышы. Трымае ён духоўную апеку і над невялікім жаночым Войнаўскім манастыром, што недалёка Руцянага-Ніды.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2007 r. upływa 5 czerwca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 834 egz.

Drodzy Wyborcy!

20 maja 2007r. mamy szansę wybrać naszych wartościowych reprezentantów do Sejmiku województwa podlaskiego. Na listach kandydatów na radnych z **Białoruskiego Komitetu Wyborczego** znajdują się ludzie, którzy swoją działalność poświęcają rozwojowi ziemi podlaskiej. Nasi kandydaci — **Białorusini i Litwini, Polacy i Rusini** tak jak kiedyś w Wielkim Księstwie Litewskim — dzisiaj swym zaangażowaniem w samorządzie województwa podlaskiego będą sprzyjać rozwojowi naszych miast, miasteczek i wsi. Kandydaci **Białoruskiego Komitetu Wyborczego** spowodują, iż sąsiedztwo z Białorusią i Litwą będzie przynosić korzyści wszystkim mieszkańcom po obu stronach granicy.

Zapraszamy do oddania głosów na listy Białoruskiego Komitetu Wyborczego.

Lista kandydatów
Białoruskiego Komitetu Wyborczego

Okręg nr I — miasto Białystok

1 **Michał Lisowski**, lat 61,urodzony w Zubowie, gmina Bielsk Podlaski, rektor Wyższej Szkoły Menedżerskiej w Białymstoku

2 **Antoni Mironowicz**, lat 47, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, profesor historii Uniwersytetu w Białymstoku, badacz dziejów Cerkwi prawosławnej w Polsce

3 **Sokrat Janowicz**, lat 71, urodzony i zamieszkały w Krynkach, literat, publicysta, wydawca „Annus Albaruthenicus"

4 **Marek Kułakowski,** lat 42, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, radca prawny

5 **Piotr Chomik,** lat 42, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, dr historii Uniwersytetu w Białymstoku

6 **Irena Andrejczuk** lat 45, urodzona i zamieszkała w Białymstoku, technik medyczny

7 **Oleg Łatyszonek**, lat 50, urodzony w Elblągu, dr historii Uniwersytetu w Białymstoku, przewodniczący Białoruskiego Towarzystwa Historycznego

8 **Michał Stelmaszuk**, lat 48, urodzony w Dublanach, gmina Michałowo, inżynier-elektronik, mieszka w Białymstoku

9 **Irena Baran**, lat 43, urodzona w Wierzchlesiu, gmina Szudziałowo, technik medyczny, mieszka w Białymstoku

10 **Radosław Dąbrowsk**i, lat 24, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, przewodniczący Białoruskiego Zrzeszenia Studentów, dziennikarz

11 **Aleksander Suszczenia**, lat 46, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, absolwent Chrześcijańskiej Akademii Teologicznej w Warszawie, przedsiębiorca

12 **Eugeniusz Petelski**, lat 49, urodzony w Gródku, inżynier elektryk, mieszka w Białymstoku

13 **Wiesław Iwaniuk**, lat 42, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, przedsiębiorca

14 **Wiktor Stachwiuk,** lat 59, urodzony w Trześciance, gmina Narew, prezes Białoruskiego Radia Racja w Białymstoku

Okręg nr II — miasto Suwałki, powiaty: suwalski, sejneński, augustowski

1 **Irena Anna Gasperowicz**, lat 38, urodzona w Sejnach, zamieszkała w Puńsku, redaktor naczelna litewskiego dwutygodnika „Aušra"

2 **Romuald Paszkiewicz**, lat 37, urodzony w Sejnach, zamieszkały w Radziuciach, rolnik

3 **Aldona Marianna Szabałaj**, lat 65, urodzona w Wojtokiemiach, zamieszkała w Suwałkach, emerytka

4 **Piotr Gintaut Witkowski**, lat 33, urodzony w Sejnach, zamieszkały w Puńsku, nauczyciel, pszczelarz

5 **Jan Olgierd Bobin**, lat 50, urodzony i zamieszkały w Puńsku, nauczyciel

6 **Piotr Giermaniuk**, lat 70, urodzony w Długim Brodzie, gmina Dubicze Cerkiewne, radca prawny, mieszka w Augustowie

7 **Mirosława Łuksza**, lat 49, urodzona w Hajnówce, dziennikarka „Niwy", poetka

8 **Stefan Świerubski**, lat 46, urodzony w Bondziszkach, gmina Rutka Tartak, pracownik Białoruskiego Centrum Informacyjnego w Białymstoku

9 **Mariusz Iwaniuk**, lat 25, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, student

Okręg nr III — miasto Łomża, powiaty: łomżyński, kolneński, grajewski

1 **Stanisław Bujnicki**, lat 54, urodzony w Białorusi, mieszka w Białymstoku, ekonomista

2 **Bożenna Bałdowska**, lat 51, urodzona w Białymstoku, ekonomistka

3 **Łukasz Filip Pieczyński**, lat 25, urodzony w Bielsku Podlaskim, student

4 **Jerzy Krysiuk**, lat 49, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, architekt

5 **Maciej Juliusz Chołodowski**, lat 43, urodzony w Białymstoku, dziennikarz i publicysta

6 **Krzysztof Janiuk**, lat 23, urodzony i zamieszkały w Białymstoku, student

7 **Piotr Leszczyński**, lat 41, zamieszkały w Makówce, przedsiębiorca

8 **Tadeusz Supiński**, lat 79, urodzony we Francji, mieszka w Białymstoku, emeryt

9 **Arnold Toczyski**, lat 36, urodzony w Białymstoku, podróżnik, pisarz, kucharz

Okręg nr IV — powiaty: zambrowski, wysokomazowiecki, siemiatycki, bielski

1 **Jan Czykwin**, lat 66, urodzony w Dubiczach Cerkiewnych, mieszka w Bielsku Podlaskim, profesor Uniwesytetu w Białymstoku, przewodniczący Białoruskiego Stowarzyszenia Literackiego „Białowieża" w Polsce

2 **Mikołaj Prokopiuk**, lat 55, urodzony w Ciechanowcu, mieszka w Siemiatyczach, ekonomista

3 **Lech Jacek Mystkowski**, lat 54, urodzony we Wrocławiu, prawnik

4 **Anna Szajkowska**, lat 32, urodzona w Bielsku Podlaskim, zamieszkała w Orli, filolog, dziennikarka

5 **Włodzimierz Sacharczuk**, lat 48, urodzony w Orli, mieszka w Bielsku Podlaskim, technik budowlany

6 **Nadzieja Artymowicz,** lat 61, mieszka w Bielsku Podlaskim, białoruska poetka

7 **Jerzy Haponiuk**, lat 45, urodzony w Kleszczelach, pracuje w Bielsku Podlaskim, handlowiec

8 **Olga Szymczuk**, lat 52, urodzona w Krzywcu, mieszka w Bielsku Podlaskim, emerytka

9 **Piotr Chomański**, lat 27, urodzony i zamieszkały w Bielsku Podlaskim, przedsiębiorca

10 **Piotr Juszczuk**, lat 57, urodzony w Krzywej, gmina Bielsk Podlaski, mieszka w Białymstoku, radca prawny, pełnomocnik finansowy Białoruskiego Komitetu Wyborczego

Okręg nr V — powiaty: moniecki, sokólski, hajnowski, białostocki

1 **Eugeniusz Wappa**, lat 42, urodzony w Długim Brodzie, gmina Dubicze Cerkiewne, redaktor naczelny białoruskiego tygodnika „Niwa", przewodniczący Związku Białoruskiego w RP

2 **Mikołaj Buszko**, lat 58, urodzony w Nowosadach, gmina Hajnówka, animator kultury, organizator Międzynarodowego Festiwalu Muzyki Cerkiewnej „Hajnówka"

3 **Eugeniusz Mironowicz**, lat 51, urodzony w Aleksiczach, gmina Zabłudów, profesor historii w Katedrze Kultury Białoruskiej Uniwersytetu w Białymstoku

4 **Michał Androsiuk**, lat 47, urodzony i zamieszkały w Hajnówce, pisarz i dziennikarz, przewodniczący Białoruskiego Forum Samorządowego w RP

5 **Włodzimierz Łukoszyk**, lat 59, urodzony w Dzierniakowie, mieszka w Gródku, mgr inż. zootechnik, rolnik

6 **Leon Pszczołak**, lat 33, urodzony w Kleszczelach, zamieszkały w Pogrebach, absolwent historii Uniwersytetu w Białymstoku, prowadzi gospodarstwo ekologiczne

7 **Hanna Kondratiuk-Świerubska**, lat 41, urodzona w Hajnówce, zamieszkała w Kotłówce, publicystka, redaktor „Zorki" w tygodniku „Niwa"

8 **Jerzy Chmielewski**, lat 44, urodzony w Krynkach, redaktor naczelny miesięcznika „Czasopis", przewodniczący Stowarzyszenia Dziennikarzy Białoruskich

9 **Eugeniusz Jańczuk**, lat 36, urodzony i zamieszkały w Hajnówce, nauczyciel historii w Zespole Szkół z Dodatkową Nauką Języka Białoruskiego w Hajnówce

10 **Alina Hapunowicz**, lat 40, urodzona w Narewce, pracownik socjalny w gminie Narewka i sądowy kurator społeczny

11 **Józef Jodczyk**, lat 64, urodzony w gminie Dąbrowa Białostocka, prowadzi gabinet rehabilitacji leczniczej

12 **Łukasz Plewa,** lat 22, urodzony i zamieszkały w Hajnówce, przewodniczący Związku Młodzieży Białoruskiej

13 **Paweł Woszczenko**, lat 25, zamieszkały w Dubinach, gmina Hajnówka, student

14 **Jerzy Suchodoła**, lat 60, urodzony w Narewce, zamieszkały w Białymstoku, emeryt

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клетці роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. горад на Дзвіне ў Смаленскай губерні = 4 _ 5 _ 18 _ 24 _ 6 _;

2. сельскагаспадарчая машына, якой ачышчаюць збожжа ад мякіны пасля малацьбы = 10 _ 11 _ 22 _ 21 _ 19 _ 20 _;

3. травяністая дэкаратыўная расліна з пахучым лісцем, з якой эфірны алей = 43 _ 42 _ 33 _ 29 _ 1 _ 50 _;

4. немаўля = 46 _ 47 _ 48 _ 49 _ 45 _;

5. японская выспа з Нагасакі = 9 _ 8 _ 3 _ 35 _;



6. не дзень = 28 _ 38 _ 37 _;

7. звязка, ахапак = 15 _ 14 _ 16 _ 17 _ 13 _;

8. вадкі метал = 39 _ 40 _ 34 _ 25 _ 26 _;

9. яе адзінкай дына = 30 _ 36 _ 44 _ 2 _;

10. тутавае дрэва = 12 _ 7 _ 31 _;

11. грашовае вымярэнне вартасці тавару = 23 _ 27 _ 41 _ 32 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Орля, баян, Кліо, Каір, фламенка, цёрн, швед, Курловіч, хрэн.

Рашэнне: **Францішак Аляхновіч**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

22.04 – 28.04

Баран (22.03. — 20.04.) Гарачыя рандэву кончацца як пачаліся. Зважай на зрывы жарсці — пасля можа цябе чакаць пахмелле. Спрыт, прадпрымальнасць. 22-24.04. — ідэальны час падпісваць дамовы.

Бык (21.04. — 21.05.) Атрымаеш цікавую прапанову, дзякуючы якой спалучыш ахвоту зарабіць і задаволіць сваю амбітнасць. З 25.04. можаш пасварыцца з сябрам за грошы (пэўных спраў нельга мяшаць з сяброўствам).

Блізняты (22.05. — 21.06.) Да 24.04. рэальна ацэніш сітуацыю; маеш шанц на вялікія і амбітныя мерапрыемствы. Канкурэнцыя мабілізуе. Беручыся за цяжкае заданне, не азірайся на іншых.

Рак (22.06. — 23.07.) Спакойна можаш рэалізаваць смелыя праекты і далёкія планы. Да 24.04. не будзеш мець падтрымкі партнёра; будзе ён нават зайздросны за твае поспехі! Шмат у якіх справах выходзіш на прамую.

Леў (24.07. — 23.08.) Ты цяпер вулкан энергіі і спрыту, энтузіязму і сексуальнасці. Адвага, гартоўнасць — пераможаш усе цяжкасці. Не купляй на крэдытную карту, асабліва да 24.04.

Дзева (24.08. — 23.09.) Аграмадная энергія і трываласць. Будзеш моцны, здольны да працяглага высілку. Затое не хапае часу, а спешка яшчэ больш будзе паглыбляць неспакой. Трымайся здалёк ад банкаў і важных папераў!

Шалі (24.09. — 23.10.) Пастаянныя і сімпатычныя лады з людзьмі. Нявыключана, што глыбокае сяброўства пераўтворыцца ў каханне. Калі хочаш інвеставаць, выберы нерухомасці ці мастацкія творы.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Адкрыеце з партнёркай новыя смакі цялеснасці. На працы няма табе раўні. Тым больш, што будзе ўсё расці апетыт на прафесійныя поспехі. Карысна было б сесці на дыету (ды дбай аб разнастайнасць ежы).

Стралец (23.11. — 22.12.) Да 24.04. ашаламляльная папулярнасць, асабліва ў супрацьлеглага полу. Інтэлігентнасць, гумар прыхіляць да цябе нават ворагаў. З 26.04. ахвота патэатральнічаць у пачуццях. На працы рушыш з капыта!

Казярог (23.12. — 20.01.) Пад канец тыдня разлічвай на адданае і шчырае каханне. Найцікавейшай будзе тая, хто табе здавалася нуднай і нецікавай. Упрыгожвай сябе і сваё атачэнне. Не раздумвай над тым, што было, а тым больш над тым, чаго не было.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 25-28.04. пільнуйся — пагражае табе вялікая фінансавая рызыка, нават банкруцтва. Асцерагайся любых рашэнняў, бо будзеш падуладны імпульсам. Пад канец тыдня неспакой, ахвота бравурнічаць. Лепш не выбірайся ў падарожжа і пазбягай небяспечных месцаў.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Незвычайная фантазія, інтуіцыя. У інтарэсах будзеш проста геніяльны, твае рашэнні будуць беспамылковыя. Хтосьці малавядомы адкрые ў табе братнюю душу. У канцы тыдня — радыкальныя дзеянні, якія могуць адмяніць усё тваё жыццё.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960